Новы ЧАС 27 снежня 2019 | № 48 (659) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №12

Літаратурная Беларусь

Выпуск №12 (160)
(снежань)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Каляда, каляда…



Святочны, старажытны дух калядны…

Ніл ГІЛЕВІЧ

Святочны, старажытны дух калядны,
Магічны дух язычніцкіх акрас,
Смалення дух, дух кміну і каляндры,
Дух на шасце падвешаных каўбас,
Калісьці ўсемагутны, усеўладны,
Што ж на куццю ты не збіраеш нас?
О, Божа! Што ў душы маёй паселіцца?
І з нашых хат, і з нашых песень-дум.

Першы снег

Рыгор БАРАДУЛІН

У абшары навакольным
Над папарам, лугам, полем
Снег тчэ мяккі змрок.
Кожную сняжынку тую
Кружыць, туліць і цалуе
Весялун-вятрок.

Дрэвы ў футры і карункі —
Шчодрыя зімы дарункі
Ахінаюць стан.
Галавой кіўнуў гулліва
Вяз тапалі сарамлівай,
Маладзейшым стаў.

І абрусам вышываным
Засцілаюцца паляны,
Далягляд і дол.
На вяселле зімкі жвавай
З дзедам грозным і ласкавым,
На багаты стол.

Дзесьці йдуць маладажоны
Сцежкай пухам вылажонай,
Шчасныя ўдваіх.
Эх, як хораша, ўрачыста,
Як душы парывы чысты
Ў час хвілін такіх!

Каляда, Каляда, на зямлі — Святы Вечар…

Ларыса ГЕНІЮШ

Каляда, Каляда, на зямлі — Святы Вечар,
нарадзіўся у яслях Збавіцель і Бог.
І пасталі бярозаў танклявыя свечкі
паабапал заснежаных, белых дарог.
Халадно. Мо таму, што зіма на парозе,
адчуваецца лютасць суровай пары,
а у полі пустым па шырокай дарозе
плачуць нечаму сумна ліхія вятры.

Чым жа сэрцы сагрэць, як той холад адужаць?
Ці агеньчыкам цьмяным ў сялянскім акне,
Калядою святой, што насуперак сцюжам
цеплынёй чалавечыя сэрцы кране?

Каляда, Каляда... Нават зорам трывожна.
Па заблытаных сцежках крутога жыцця
да сваіх ў гэты вечар спяшаецца кожны,
дзе ў сям'і за сталом нас чакае куцця.

Сена пах, яліны, стаяць розныя стравы,
прытаміўшыся, маці шчаслівa маўчыць.
Садзяцца сыны на шырокія лавы,
што сышліся дамоў, каб душой адпачыць.

Добра сесці разом, слязу радасці ўцерці,
адчуваць, што ў застоллі,
што побач браты,
у душы чысціня і узнёслыя сэрцы,
бо з людзьмі разам Бог ў гэты
Вечар Святы.
Сёння сэрцам з усімі куццю раздзяляем,
хто за стол наш не змог на вячэру прыйсці,
ўсіх далёкіх і родных сваіх ўспамінаем
і дабра ўсім і шчасця жадаем ў жыцці.

Няхай будзе вам цёпла,
бы ў бацькавай хаце,
ў гэтым свеце шырокім, дзе столькі дарог.
Няхай людзі зямлі для вас будуць,
як браццця,
і жыццёвыя сцежкі прастуе вам Бог.

Можа, хто занямог, можа, хто пахіснуўся,
загубіўшы сумленне ў нялёгкім жыцці,
прытаміўся ў шуканні сваe Беларусі —
памажэце й такім на вячэру прыйсці.

За святочным сталом —
няхай кожнаму месца
каля вернага сэрца сясцёр і братоў.
Няхай будзе у вас, як ў харошай сямейцы,
ўсім па роўні ў жыцці і куцця, і любоў.

Няхай вера ў любоў, свая мова ў застоллі,
а у думках — зямля, дзе спачылі дзяды,
няхай ўсюды ласкава спрыяе вам доля,
а любоў, чалавечнасць мацуе рады!

Зіма на бацькаўшчыне

Максім ТАНК

Дзень цэлы плавалі вятры
Над восенню палёў бязмежных,
Пад вечар снегам завірыў
Спазніўшыся кудлаты снежань.
Ён ахінуў стагі лугоў,
Як верацёны, снежнай воўнай,
З-пад Налібок, з балот, лясоў
Плыты ільдзін пагнаў па Нёмну.
Ён хвалі дрэмлючай раллі
Рвануў за вараныя грывы, —
І ажылі, і паплылі
На бор узды́бленыя нівы.

Але навалу хмар цяжкіх
Стрымалі выгнуўшыся хвоі.
Адно па соснах залатых
Ўзнялося полымя сівое,
У змрочных лапках зацвіло,
З бяроз успыхнуўшага вецця
На сухастой, на буралом
Яго панёс аслепшы вецер.
Збудзіўся нетраў цёмны гул,
З лагоўяў воўкі і выкопаў
Папоўз па свежаму снягу,
Па выбітых руёю тропах.

Зіма... Ад інею вішняк
Перахіліўся за парканы.
І не мінеш яго ніяк,
Кранеш — і цветам серабраным
Асыпе з галавы да ног.
На дзенніке вароны стадам
Лятуць з прасёлачных дарог.
Іх цень плыве праз палісады,
Дзе ўсё, як вогнішча лістоў,
Замёў снег свежы, сшаранелы,
Дзе першых заячых слядоў
Глухія петлі забялелі.

Калі-ж, вячэрняю парой,
За вёску выйдзеш на прыволле,
Цябе сустрэнуць чарадой
Шляхоў знаёмыя таполі,
Пачуеш як трашчыць рака,
Скрыпяць асверы на марозе,
Як пад дугой маладзіка
Пяюць сялянскія палозы.
І шляху зорнага агні
У кожнай у сняжынцыззяюць
І ў сэрцы, што з далечыні
Па родным сумавала краю.

Прыходзіш з нагоды ці з суму…

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

Прыходзіш з нагоды ці з суму,
З віны, а ці з лютай зімы?
О, колькі няўдзячнага шуму
Трымаюць трывожна дамы!

Ты й зараз баішся змыліцца
На дрогкі агонь у акне.
Замецена снегам сталіца
Ці позні твой след да мяне?

Прысядзь, я цябе не прымушу
Адкрыцца ў расстайнай журбе
І шчасця твайго не парушу,
Калі яно ёсць у цябе!

Пад вятрамі…

Генадзь БУРАЎКІН

Пад вятрамі згорбіліся ўзгоркі.
Сосны ўздзелі снежныя брылі.
Промні, як блішчастыя іголкі,
Рассыпае сонца па зямлі.

Цягнецца дарога Шляхам Млечным.
Зоркамі ўскіпае белы снег.
І не знаеш — вечны ці не вечны
Ты ў бяскрайняй гэтай белізне.

Можа, раптам колкі вецер зімні
Завірухай ранняю ўзмахне
І на крылы ледзяныя ўзніме,
І ўжо не апусціць больш мяне?

Што ж, няхай усё, што маю,
лясне.
Толькі аднаго да слёз шкада —
Гэты вось, заснежаны і ясны,
Мілы свет навекі пакідаць.

Хай ён і халодны, і калючы,
Без густой травы і сінявы —
Толькі ўвесь рыпучы і пявучы,
Заінелы,
звонкі
і жывы...

Пятролюбы

Аксана СПРЫНЧАН

Формулы

«Пятрогліф: формула — чатыры «З». Звышлаканічнасць, звыш'ёмістасць, звышэканомія, звышглыбіня. Камень піша на камені».

А пятролюб: формула дваіх — Пятра і Любові. А піша Аксана.

Давер

Пятро Васючэнка — гэта суцэльны давер. Да людзей, да ўсялякай жывой істоты. І нават да рэдактара. І мне як рэдактарцы — Боскі да(вер)р, што я сустрэла аўтара, які бясконца давярае. Любоў любоўю, але рэдагаванне — гэта як побыт у сямейным жыцці. І калі ў гэтым побыце не паўстае ніводнага цэню, значыцца Аўтар і Рэдактар сустрэліся ў тым шчасці, якое мала каму дадзенае.

Лабірынт

Пятро Васючэнка — лабірынт. Адрозна ад полацкага — у гэты лабірынт лёгка патрапіць: жыві сярод казак і вершаў, навуковых артыкулаў і апавяданняў, міфаў і фэнтэзі, прыгодаў і літаратуразнаўчых манаграфій, п'ес і даведнікаў, эсэ і рэцэнзій, радыёлекцый і радыёпастановак. Адрозна ад лабірынта — з яго не шукаеш выйсця.

Жабкі і свінкі

Калекцыянерам утульна разам, асабліва калі ён — калекцыянер свінак, а яна — калекцыянерка жабак. І без адных, і без другіх цяжка ўявіць беларускі свет. А да таго ж свінкі не замінаюць жабкам, а жабкі — свінкам. І ў гэтым –рэдкая суладнасць беларускага свету.

Дзіця

Дзіця — найлепшы падарунак. Нават чужое. Адзіны, хто напісаў пра гэта ў беларускай літаратуры, — Пятро Васючэнка. У "Дні народзінаў катá Буркуна" котка дорыць Буркуну кацяня, якое нарадзілася ад іншага. Дзівосны запавет, што пакінуў творца ў зборніку вершаў, казак і апавяданняў «З Днём народзінаў, альбо Свята, якое ёсць у кожнага», які я ўкладала і які быў апошнім, што выйшаў перад сыходам аўтара.

Паспела

У дачыненнях з людзьмі шмат чаго не паспяваеш сказаць. Пераважна нічога не паспяваеш. Ды я паспела сказаць, што Пятро Васючэнка — геніяльны. Але і тут не ўсё атрымалася, бо казала пра творцу, а ён жа і чалавек геніяльны.

Адзіная кніга

Крупскі раён. Хата на ўскрайку балота. Адзначаем з сябрамі Новы год. Дзевяностагадовая гаспадыня прытамілася і залезла на печ. Мы спрабуем не шумець. Сябра дастае кнігу Пятра Васючэнкі «Адлюстраванне першатвора», і, вядома ж, я ўзгадваю, што Пятро Васючэнка калекцыянуе свінак, таму мы можам сустрэць поўнач разам са свіннёй (і бабулі не будзем перашкаджаць). Бярэм шампанскае, кнігу і выпраўляемся ў хлеўчык. Чытаем уголас, дзелімся шампанскім са свіннёй (мы ж не скапныя свінні). Ці не адзіны Новы год, калі я чытала і вакол на сотню метраў не было ніводнае кнігі.

Калі ўзгадваю, думаю, што з кнігай Пятра Васючэнкі можна ляцець у космас. Бо космас прыме космас.

Прэмія Дзядзькі

Сумна ці не, а застаўся Пятро Васючэнка па-за прэміямі. Апрача Глінянага Вялеса і Блакітнага Свіна. Таму гэтыя прэміі для мяне ўзвысіліся. Але ж асоба такога творцы цягне на прэмію ягонага імя. Хто б не марыў атрымаць Прэмію Пятра Васючэнкі?! Прэмію Дзядзькі. Цётка была б не супраць.

Святая рыса

Неўзабаве вясна. Ніхто мяне болей не павіншуе з сёмым днём вясны, ведаючы, што я не святкую восьмы. Ёсць людзі, якія ўмеюць ствараць свята. І гэта святая рыса.

Усмешка

Ёсць творцы, якія ўсміхаюцца табе, калі іх сустрэнеш. А як іх чытаеш — усмешка знікае. Пятро Васючэнка меў надзвычайную здольнасць захоўваць усмешку і ў жыцці, і ў прозе, драматургіі, вершах… Гэтакая ўсмешка — неўміручая.

Сцяг ля сэрца

Калі сябра хацеў пакінуць свой сцяг, каб не схапілі спецназаўцы, Пятро Васючэнка схаваў сцяг ля сэрца і вынес, але сцяг ужо не аддаў. Імкненне выратаваць і захаваць — сутва Пятра Васючэнкі.

Дом

Пятро Васючэнка — дом. Не самотны. Дом — з сям'ёй. Дом — з універсітэцкімі калегамі. Дом — з радыйнікамі. Дом — з сябрамі садовага таварыства. Дом з пісьменнікамі… Ідэя Дома для яго надзвычай істотная. Істотная яна і для іншых, але далёка не ва ўсіх яна — рэальнасць.

Пажар

Калі на адным з лецішчаў распачаўся пажар, прыбег тушыць адзін Пятро Васючэнка. Вядома ж, я ведаю тое не ад яго.

Вяселле як абеларушванне

Пасля памінак я сустрэла цікавага беларускамоўнага кіроўцу. І гэта гады ў рады бывае. Але ж ён яшчэ і стаўся беларускамоўным, пабыўшы на вяселлі Пятра Васючэнкі!

Усё ж не ўсе казкі сканчаюцца вяселлем.

Прадмова

Мне дужа карцела, каб у маёй першай кнізе была прадмова, а выдавецтва не хацела. Валянцін Акудовіч тады супакоіў тым, што кніга, як і кабета, найлепей выглядае аголенай. Але калі мы з Алесем Анціпенкам выдавалі смс-п'еску «Дарога і Шлях», мы апранулі сваю кнігу з абодвух бакоў: і прадмовай, і пасляпмовай. Яны ці не большыя за наш твор. І Пятро Васючэнка абдарыў шчасцем прадмовы, якую я люблю перачытваць, насалоджваючыся розумам і парадаксальнасцю аўтара. Яна як казка, якая лучыць навуковы артыкул і эсэ, верш і паэму ў прозе. Не трэба аніякай агаленасці, калі твор уграе Пятро Васючэнка.

На векі вечныя

Пятро Васючэнка любіў усіх жывых істотак: чарвячкоў і рыбак, жабак і ракаў, жучкоў і жамяру, хахуляў і катоў. Ён і мяне любіў, бо я любіла жабак. Гэта для яго было істотна, таму і напісаў у артыкуле пра нацыянальны бестыярый: «Аксана Спрынчан на векі вечныя праславіла амфібію. Лірычная гераіня можа ўяўляцца ластаўкай, знічкаю, кактусам, але яна ніколі не скіне свае жабінае скуркі, бо пачуванне каралеўны, закінутай у багну побыту, складае яе існасць».

Не гэтак і шмат людзей, якія любяць цябе, бо ты любіш іншых…

«Быць жаласлівымі»

«Спадарыням Аксане і Альжбэце, шчыра быць жаласлівымі да ўсяго жывога, быць літасцівымі да сваіх каралевічаў», — гэтак падпісаў апошнюю кнігу наш улюбёны аўтар. І каб гэты запавет з'явіўся ў якім-кольвечы тэксце без імя аўтара, кожны, хто ведаў і чытаў Пятра Васючэнку, не памыліўся б, адгадваючы, чый запавет.

Два лісты

«Я Вас люблю! І Вашыя творы!»

«Узаемна, і неадменна, і назаўжды. П.В.»

Падлічваем жанчын…

Алена НЯПАЛЬСКАЯ

У Нямеччыне правялі пілотнае даследаванне, закліканае ацаніць прысутнасць і бачнасць жанчын-аўтарак у СМІ.

Вывучэнне адбылося ў межах шматгадовага даследчага праекту #countingwomen літаратурнай асацыяцыі «AG DIVERSITÄT» у супрацоўніцтве з аддзелам даследаванняў сродкаў масавай інфармацыі Універсітэта Росток. Ідэя правядзення даследавання ўзнікла пасля круглага стала, скліканага Міністрам культуры і СМІ Нямеччыны. Сам жа праект #countingwomen накіраваны на збор дадзеных пра прысутнасць жанчын-аўтарак у аглядах літаратуры, прысуджэннях літаратурных прэмій, выдавецкіх праграмах, школьных навучальных матэрыялах, а таксама ў складах журы і вылучэнні стыпендый.

Даследчыкі мяркуюць, што вынікі праведзенай працы будуць не толькі апублікаваны, але і ўлічаныя рознымі арганізацыямі, у тым ліку дзяржавай у сваёй дзейнасці.

Што даследавалі эксперты

У 2018 годзе 45 добраахвотнікаў прааналізавалі 2036 аглядаў з 69 нямецкіх медый (друк, радыё, тэлебачанне) па пэўных зададзеных параметрах. Галоўнымі пытаннямі былі:

— Ці існуюць уяўныя адрозненні паміж прысутнасцю ў СМІ жанчын аўтарак і аўтараў-мужчын?

— Ці існуюць пэўныя функцыі, якія можна аднесці выключна да полу рэцэнзента?

— Якія жанры дамінуюць, у якой ступені і хто іх праглядае?

— Ці існуюць адметнасці ў залежнасці ад гендэрнага размеркавання (рэцэнзентаў і аўтараў)?

Рэзюмэ

Аналіз быў і статыстычны, і сацыяльны. Сродкі масавай інфармацыі выбіраліся, каб найбольш рэпрэзэнтатыўна адлюстраваць нямецкую журналістыку. Аналіз паказаў, што жанчыны значна меней бачныя ў сродках масавай інфармацыі і на літаратурнай сцэне — у адрозненне ад мужчын. Асноўныя вынікі такія…

Двое мужчын прыходзяцца на адну жанчыну.


Ва ўсіх СМІ, за выключэннем жаночых часопісаў, аўтары-мужчыны прысутнічаюць часцей і прадстаўлены больш разгорнута: дзве траціны рэцэнзуемых кніг напісаны мужчынамі; суадносіны «2 да 1» распаўсюджваюцца на ўсе тыпы сродкаў масавай інфармацыі.

Мужчыны больш пішуць пра мужчын. А жанчыны? Яны таксама.

Крытычныя матэрыялы ствараюць мужчыны і жанчыны ў прапорцыях 4 да 3. Акрамя таго, мужчыны пераважна пішуць пра творы мужчын: тры чвэрці ўсіх кніг, якія разглядаюць мужчынамі, напісаны аўтарамі-мужчынамі. З іншага боку, жанчыны звычайна разглядаюць творы і мужчын, і жанчын аднолькава.

Непрыдуманая і крымінальная літаратура: 5 рэцэнзій на творы аўтараў-мужчын і 1 на творы жанчын.

Непрапарцыйная ўвага крытыкаў-мужчын да мужчын-аўтараў існуе практычна ў кожным літаратурным жанры: у дыяпазоне дакументальнай літаратуры толькі кожная пятая кніга, якую разглядае мужчына, напісаная жанчынай-аўтаркай. У крымінальнай літаратуры неадпаведнасць найбольш яскравая: не толькі саміх аўтараў-мужчын болей (76%) у параўнанні з жанчынамі, але і 82% мужчын пішуць рэцэнзіі ў гэтым жанры.



Малюнак www.voxukraine.org

Больш месца вылучаецца для мужчын, якія пішуць пра мужчын.

Агляды, складзеныя мужчынамі, значна больш падрабязныя, чым такія ж пра жанчын. Акрамя таго, у выданнях больш месца займаюць творы аўтараў-мужчын. У выніку бачнасць аўтараў-мужчын павялічылася. У дыяпазоне крымінальнай літаратуры таксама быў выяўлены адпаведны дысбаланс.

Мужчыны больш бачныя на тэлебачанні. На радыё большую прысутнасць маюць жанчыны.

На тэлебачанні на агляд жаночых твораў было адведзена 580 секунд, мужчынскія ж кнігі аглядаліся 931 секунду. Аднак у дыяпазоне радыёвяшчання, хоць творы жанчын і аналізаваліся радзей, агляды былі больш працяглымі па часе.

Такім чынам, аўтары нямецкага даследавання прыйшлі да высновы: пісьменнікі і крытыкі-мужчыны пераважаюць на сцэне літаратурных аглядаў (дзве траціны ўсіх рэцэнзій асвятляюць творы аўтараў-мужчын). Мужчыны ў асноўным пішуць пра мужчын і займаюць значна большае месца для аглядаў іх твораў і творчасці. Толькі жанр дзіцячай і моладзевай літаратуры выглядае збалансаваным. А ў такіх жанрах, як непрыдуманая літаратура і крымінальная, якія лічацца больш інтэлектуальнымі альбо «мужчынскімі», дамінуюць выключна мужчыны.

Вынікі пілотнага даследавання складуць аснову для больш глыбокага гендэрнага аналізу літаратурнага ландшафту. Атрыманыя дадзеныя будуць праверананы ў межах новага апытання на працягу больш працяглага перыяду.

Згаданае і будучыя даследаванні будуць прадстаўлены на www.frauenzählen.de і на англійскай мове на www.countingwomen.com.

Сем бочак арыштантаў



Франц СІЎКО

Аднымі толькі аб'ектыўнымі прычынамі тлумачыць выцясненне мастацкай літаратуры з абсягу нашых зацікаўленняў не выпадае.

Хоць чытанне і з'яўляецца заняткам для розуму, усё-такі ў большай ступені яно, напэўна, — занятак для душы. Важнаю прыкметаю якога спрадвеку была даходлівасць, уцямнасць. Тая ўцямнасць, якой большасці сучасных мастацкіх твораў, як прозы, так і паэзіі, відавочна бракуе. Нашае захапленне стылёвымі пошукамі, сэнсавая размытасць тэксту, недакладнасць словаўжывання, а то і адсутнасць належнага ўзроўню граматнасці — усё гэта не спрыяе росту папулярнасці кнігі. Гэтаксама, як і часопіса, бальшыня тэкстаў якога часам — відавочная халтура ў выглядзе галаваломак з прэтэнзіяй на запачаткаванне самых сябе ў якасці адэптаў новага слова ў прыгожым пісьменстве.

У свой час трапна выказаўся пра няўцямнасць у словатворчасці Л. Талстой: «Нельга казаць пра твор мастацтва: вы не разумееце яшчэ. Калі не разумеюць, значыць, твор нядобры, бо яго задача ў тым, каб незразумелае зрабіць зразумелым». Наогул, пісьменнік лічыў схільнасць да мудрагелістасці выказвання (пісьма) праяваю душэўнай хваробы аўтара.

Гэтаксама і ў страты людской цікавасці да літімпрэзаў маюцца суб'ектыўныя прычыны. Вось адкуль той цікавасці з'явіцца, калі, да прыкладу, добра, як дзесяць адсоткаў выступоўцаў да заяўленых у аўдыторыі выступаў рыхтуюцца належным чынам. Звычайна так: пару-тройку кантычак сунуў чалавек за пазуху — і ўсяе падрыхтоўкі. Пяць хвілін потым дастае дзядзька ці цётка прылюдна ў аўдыторыі тыя кантычкі, яшчэ гэтулькі часу разгортвае. Затым пачынае чытаць — нудотна, невыразна, быццам напаўголаса літанію па нябожчыку адмаўляе. А не, каб пераадолець уласную ляноту ды на памяць хаця б вершык-другі ці кавалак уласнае прозы вывучыць. Потым, здарыцца, яшчэ каторая паперчына выслізне ў небаракі падчас чытання са жмені — нагнецца паднясь і корпаецца, корпаецца пад сталом на пацеху прысутным.

Яшчэ адна мова на даляглядзе замаячыла. Быццам бы расейская, толькі вось беларускімі словамі «ўзбагачаная». Добрыя людзі такую звычайна называюць «трасянкаю». А тут яна, як вынікае з маналога жанчыны, што пры складанні вершыкаў ёю карыстаецца, — «новая» мова. Сядзіць кабеціна ў тэлестудыі ды не мігнуўшы вокам распавядае пра тое, як яна, мовы тутэйшае не ведаючы, дзеля спасціжэння душы карэннага народа да такога вынаходніцтва дайшла і як, мабыць, будуць усцешаныя ў будучыні даследчыкі яе паэзіі, натыкнуўшыся на старонках кніжак на гэткі бясцэнны «моўны скарб».

Набокаў у «Дары» адзначае, што, нягледзячы на пэўную рэзкасць поглядаў Чарнышэўскага на тагачаснае расейскае грамадскае ўладкаванне, некаторыя саратаўскія гімназісты «захапіліся ім» (у сэнсе — яго поглядамі). І адразу пасля гэтага — пасаж пра тое, што з усіх колішніх вучняў Міколы Гаўрылавіча на яго пахаванне прыйшлі праз сорак гадоў ці то толькі двое з тых гімназістаў, ці то наогул — не прыйшоў ніводзін. Што, як вынікае з інтанацыі аповеду, быццам бы сведчыць пра яго неперакананаўчасць у ролі педагога.

Але ж, напэўна, якраз уменне настаўніка адпускаць вучняў у вялікі свет без прэтэнзіі на іх пажыццёвую ўдзячнасць і памяць — найперш сведчанне належнага ўзроўню яго прафесійнае вартасці. І, наадварот, жаданне трымаць выхаванцаў ледзь не да скону ў полі ўласнага бачання свету — не што іншае, як праява эгаізму. Канечне, нядобра, калі настаўніка замала, але і калі зашмат — таксама нічога добрага.

Ці не тое самае датычыць і настаўніцтва ў літаратуры. Дзе, дарэчы, на недахоп яго ў дачыненні да сябе часцей за ўсё наракаюць людзі, самі да настаўніцтва з-за кепскага нораву элементарна няздатныя.

Найдакладней матывы і мэты дарадцаў ад мастацтва (у тым ліку, вядома, і літаратуры) на прадмет таго, што можа, а што не можа быць для творцы аб'ектам зацікаўленасці, акрэсліў Борхес: «Тыя, што кажуць, быццам мастацтва не павінна нараджаць дактрынаў, маюць на ўвазе дактрыны, якія не супадаюць з іх уласнымі».

Так што не варта бачыць за злосцю рознага кшталту дыджэяў ад мастацтва толькі дбанне пра яго стан. Усё значна прасцей. І ўсё, як правіла, — гучання асабістага. Дарэчы, добра, ва ўнісон з аргенцінскім калегам выказаўся па тэме Х. М. Энцэнсбергер: «...для мяне паэзія ўсяедная. Усё, што можа быць цікавым чалавеку, знаходзіць тут сваё месца».

Проза некаторых японскіх аўтараў — бы крохкі лёд пад нагамі на пачатку зімы. Белівa снежнае бязважкасці, па-за якою — анічога, апроч цішыні. Такой таемнай, загадкавай і непрадказальнай, што так і карціць як хутчэй у яе акунуцца.

Што здзіўляе ў любай сэрцу «Доўгай дарозе дадому» Васіля Быкава, дык гэта бязрадаснасць пададзеных аўтарам карцін дзяцінства. Ажно такімі бязрадаснымі, шэрымі яны, асвечаныя імпэтам першароднага пазнання свету, паводле азначэння быць наўрад могуць. Тут, хутчэй за ўсё, спрацавала



Фота www.pixabay

банальная адсутнасць падзей, здольных апісанню нават самай змрочнай явы дадаць фарбаў і каларыту пазітыўнага.

Нават зусім няўдалыя кніжкі не раздражняюць. Магчыма, таму, што заўсёды ведаеш, што хочаш пачытаць, і на тое, што магло б раздражняць, папросту рэдка натыкаешся. Але калі нават часам і натыкаешся, гэта не нервуе і не раздражняе. Не тое, што хацелася б? Што ж, адкладзем убок, гэтаксама, як адыдземся падалей, нарваўшыся неўспадзеў на несімпатычнага чалавека.

А вось што раздражняе, дык гэта празмернае дбанне некаторых калег пра лёс літаратуры. Што пра яго дбаць? Нават калі і зусім спыніцца прыгожае пісьменства ў сваім развіцці, напісанага да нас застанецца так шмат, што ўсім і кожнаму на тысячу гадоў наперад хопіць.

З чытаных апошнім часам пісьменніцкіх ліставанняў самымі шчырымі падаліся лісты Салтыкова-Шчадрына. Пры ўсёй іх зместавай аднастайнасці і мностве паўтораў, асабліва датычна нараканняў адрасанта на кепскае здароўе і гэткія ж узаемаадносіны з жонкай, няма ў іх, падалося, гульні на публіку.

Яшчэ адна бясспрэчная каштоўнасць лістоў гэтага пісьменніка — смеласць у падачы фактаў літаратурнага жыцця. І найперш у плане ўзаемадачыненняў з цэнзураю і паводзінаў літаратараў у сітуацыі, калі патрабуецца ўчынак у абарону свабоды словы. Асабліва пераканаўча гучыць гэта ў перыяд атмасферы вакууму, у якім Салтыкоў-Шчадрын апынуўся як апальны былы рэдактар «Отечественных записок» пасля іх гвалтоўнага зачынення ў 1884 годзе.

Адна з перадумоваў паспяховасці пісьменніка — даходлівасць. І падчас напісання твора, і падчас рэалізацыі гатовага прадукту. Звычайна гэтай рысе не надаюць значэння, надзяляючы літаратара пабытавай нехлямяжасцю, бездапаможнасцю, няўменнем распараджацца ані ўласным лёсам, ані лёсам сваіх твораў. І дарэмна.

Вось, напрыклад, Гогаль, кошт маёмасці якога, паводле акта вопісу яе пасля смерці пісьменніка, складаў усяго 43 рублі 88 капеек срэбрам, на думку аўтара яго жыццяпісу І. Залатускага, «зусім не быў бессярэбранікам». Прынамсі, ён так умела вёў свае справы, датычныя продажу кніг, так быў у гэтай сферы вынаходлівы, што калі часам дапускаў які-небудзь збой, то, як правіла, не праз уласнае нядбальства ці няўмельства, а адзіна праз недагляд канфідэнтаў.

Бог ёсць любоў — усё-такі не тое. Напэўна, куды лепш было б атаясамліваць Яго са справядлівасцю. Ці прасцей — з праўдаю. Любоў у параўнанні з праўдаю — куды больш прыблізная, расплывістая катэгорыя. Адпаведна, для розных спекуляцый ды маніпуляцый вельмі зручная.

Святар падчас малітвы верных на Імшы: «Молімся за ахвяраў тэрактаў у святынях Шры-Ланкі і аб прабачэнні для тых, хто іх учыніў». Канечне, як жа без гэтага. А яшчэ лепш было б — загадзя, яшчэ да ўчынення тэракта прабачыць і праз таблоіды пра гэткі чалавекалюбны жэст усяму свету распавесці.

Часам грубаваты, але заўсёды дасціпны святар Дзмітры Смірноў умее агарошыць верніка адказам:

1

Жанчына: «Падчас пажару, бацюхна, абгарэла ў нас у хаце ікона. Што б гэта магло значыць?»

Святар: «А тое, што ў вас у хаце маецца праблема з супрацьпажарнаю бяспекай».

Жанчына: «І ўсё?»

Святар: «А што, гэтага хіба мала?»

2

Жанчына: «Вучу ўнучку маліцца, а дачка мая, маці дзяўчынкі, прыходзіць потым да мяне ў хату і дурніцаю за гэта называе. Што рабіць, бацюхна?»

Святар: «Не адчыняйце дачцэ дзвярэй».

Жанчына: «Дык яна патэлефануе».

Святар: «Не адгукайцеся. І нумар тэлефона як хутчэй памяняйце».

Падчас карэктарства ва ўніверсітэцкім выдавецтве больш за ўсё здзіўлялі падабенствам зместу навуковыя даследаванні філасофаў. І найперш — трафарэтнасцю ў пераліку постацяў знакамітых папярэднікаў. Гайдэгер, Кіркегар, Шапенгаўэр, Артэга-і-Гасэт, Дэрыда, Дэлёз — джэнтльменскі набор прозвішчаў, без якога, трэба меркаваць, і філасоф не філасоф. Тое самае, што літаратуразнаўца без Кафкі, Набокава або Джойса ў якасці гуру. Ці сучасны віцебскі культуролаг без Малевіча альбо Шагала на кончыку пяра.

Восень. Буслы ўжо адляцелі ў вырай, але адзін, з паламаным крылом, не даў рады паляцець з суродзічамі, застаўся пры родных палетках. Худы — дзюба ды пер'е, бачна, што не жылец. Млява корпаецца ў траве наўзбоч дарогі, вышуквае хоць якога-небудзь харчу.

Побач — сціpта з саломаю, а на сціpце — коршак. Сядзіць, вычэквае, калі ж і яму ад шчадротаў прыроды, нарэшце, перападзе.

Пры любым надвор'і, пры любой кан'юнктуры слушнае, ад празмернага дбання пра самыя раз'еўрапейскія, разагульначалавечыя каштоўнасці вольнае — выказванне скульптара Эрнста Неізвеснага: «Заплечных справаў майстар можа і падсезаньваць, і падхэмінгуэйваць, і падкафкваць — без шкоды для ідэалогіі». Крыху, мабыць, недакладна, лепшы было б: «галоўнае, каб без шкоды для...». Тады ўжо — стоадсоткава бяспечна.

Хацела жанчына ўзяць 80-гадовую бяздзетную сястру, гэткую ж, як і сама, удаву, толькі на два дзясяткі гадоў маладзейшую, у горад, ды тая не згадзілася. Маўляў, звязеш адсюль, а потым у гэным горадзе на чужых кладах і пахаваеш. А мне гэтак не цікава. Я тут, паблізу роднае хаты, побач з мужам-нябожчыкам хачу легчы.

Кінула жанчына часова ў горадзе кватэру, паехала ў вёску даглядаць нямоглую старую.

Год пражылі сёстры разам у хаце, два. Абедзве стаміліся, але маладзейшая відавочна больш, хоць выгляду не падае. І ўсё-такі аднойчы не вытрывала, прагаварылася суседцы пра ў глыбоканькім спраце душы на дне прыхаванае. «А ведаеш, што, мабыць, самае кепскае на свеце? Здагадвацца, што, калі нават і любяць цябе моцна, і шкадуюць, а смерці тваёй усё адно — чакаюць».

Канцэнтрацыя трагедыйнасці паведамлення ў стужцы Агенцтва навінаў ад 28 верасня 2017 года амаль такая ж, як магла б быць, напрыклад, у абвестцы пра пачатак вайны. «Трагічная навіна з Лос-Анджэлеса. Спачыў заснавальнік і шэф-рэдактар часопіса «Плэйбой» Х'ю Хефнер. Яму быў 91 год...»

Здаецца, дарога як дарога ля таго патанулага ў хмызе, напалову спусцелага, звыклага да непамыснотаў вясковага жыцця Александро́ва. Ну, патрэсае крыху, пакалыхвае аўтобус, ды што тое ўсё ў параўнанні са спярэшчанай рытвінамі і ямамі дарогаю даўжынёю ў сем вёрстаў да школы ў дзяцінстве?

Гарадскія спадарожнікі, нязвыклыя да такіх нязручнасцяў, крywяць насамі, моршчацца: маўляў, якое нядбальства. І паспрабуй ім давесці, што агромністая плошча Перамогі, што на грошы ад пабораў з сельскіх раёнаў у абласным цэнтры ўладжаная, — ані не меншае ўвасабленне нядбальства, як гэтая недагледжаная, да якой нікому, падобна, няма і не будзе ўжо ніколі справы, дарога наўзбоч Александрова.

Вусны партрэт з лятучымі ценямі



Марыя ВАЙЦЯШОНАК

***

Яны прыехалі. Марыя выйшла, на хвіліну спынілася, быццам рыхтуючыся перад выхадам на сцэну, на людзі, і пайшла насустрач. У абедзвюх руках яна трымала кветкі ў такім звычайным, з крамы, кашпо. Несла іх быццам вясельны букет, як дзіця, урачыста й цнатліва. Кветкі былі белыя, хрызантэмы. Але праз некаторы час, праз некалькі дзён пасля сустрэчы я заўважыла, што яны сталі трох колераў. Я вельмі здзівілася, мне падалося, што, пабыўшы ў руках мастачкі, яны прыдбалі колер, адбылося нешта магічнае, таму што я добра памятаю: яны былі чыста белыя!

Яна сядзела за сталом, гаварыла мала і толькі сказала, можа, самае каштоўнае ў канцы палудня:

— Я адчуваю сябе, нарэшце, у сваёй талерцы. Са мной даўно такога не было.

Нічога не пыталася, амаль не ўдзельнічала ў размове на словах, але ейная поза, складзеныя рукі, погляды раз-пораз на каго-небудзь, хто гаварыў ці нешта расказваў, былі шматзначнымі. Было відаць, што яна з намі.

Мне ўспамінаецца, як мы ездзілі да яе купляць карціны, да яе дамоў. Гэта была зусім інакшая жанчына. Нехта з нас загаварыў пра адзіноту, як з ёй змагацца і ці трэба? Яна сказала, што ёй ніколі не бывае сумна. Мне падалося, што яна не ўпэўнена ў гэтым. І калі яна так гаворыць і так мяркуе, тым больш што нават калі ад'язджаў куды-небудзь на выставы муж, яна адчувала яго, нібыта ён быў паўсюль. Яна дыхала ім. Ён быў у паветры, быў усюды, дзе яна знаходзілася, яна так і сказала: «Я чамусьці ўвесь час бачу яго хлапчуком у снах. Чамусьці заўсёды вельмі клапачуся аб ім».

Мы хадзілі па ейным садзе, незаўважна яна аддалялася ад нас, калі мы ішлі ўперад, яна нейдзе затрымлівалася і стаяла, быццам яе наогул не было. Потым зноў з'яўлялася. У нечым звычайным апранута, у хатнім. Мы падыходзілі да майстэрні, якая знаходзілася ў другім месцы, і яе гублялі. Потым у паветры неспадзявана вырысоўвалася, узнікала ў нечаканым месцы, таксама як і ў садзе, без ніякага ўдзелу. Гэтаксама было, калі мы былі ў доме і глядзелі карціны. Яна паказвала, падавала, прыносіла, мы нешта пыталіся. Сама яна ў гэтым абмеркаванні амаль не ўдзельнічала. І здавалася, ніякага кантакту не адбылося. Нам падабаліся карціны, мы разлічваліся. Мы дзякавалі, бо купілі тое, што нам хацелася, і раптам у мяне з'явілася жаданне застацца тут, менавіта на другім паверсе, там, дзе было шмат яе работ. Застацца, паслацца на падлозе і заначаваць. Я не магла сабе растлумачыць той пожад. Было пачуццё, што не нагаварыўшыся з мастачкай, ні аб чым сур'ёзна не распытаўшы яе, хацелася набыцца, даставаць і даставаць падрамнікі, узірацца, разглядаць, каб нешта зразумець аб ёй самой. Так мы заўсёды не адразу, няспешна адыходзім ад ручая, напіўшыся...

Калі ўжо полудзень у нашым доме закончыўся, яна ўстала з-за стала. Чырвоная блюзка на ёй была, мне здаецца, завушніцы таксама чырвоныя. Мне падалося, скрануліся завушніцы, і ў ёй, можна сказаць, бліснула нешта іспанскае. Нешта свавольнае, яно то з'яўлялася, то гасла, быццам усё гэта было ў ейных руках, яна магла гэта сабе дазволіць — і тым самым адразу схавацца.

Мы развіталіся і гаварылі мала слоў. І ўжо адыходзячы да машыны, яна раптам валадарна, як уладычыца, павярнулася і сказала: «Я за вас спакойная. У вас ўсё будзе добра».

Я нічога не магла адказаць, усюды запанавала ціша, як у вакууме.

Гэта было так нечакана, так па-боску, як благаслаўленне, і я першы раз у жыцці адчула, што такое талент, хто такая таленавітая жанчына! У Італіі яе называлі «каралевай нацюрморту», а ў мяне засталося ўражанне, падобнае да боства. Багавіца з іншых зямель, мне невядомых.

***

Нядаўна я пазнаёмілася з Таццянай Гаранскай.

Спынілася машына. Таня села да нас на заднім месцы ў нечым светлым, белым, запомнілася блюзка дробнымі фальбонамі. Уражанне было, што мы пасадзілі птушку гаманкую, гаваркую, што мы яе злавілі ў рукі, яна трапяталася, увесь час нешта, хвалюючыся, гаварыла, распавядала. Здавалася, што калі адчыніш дзверцы, яна вылеціць, не сыйдзе з машыны, а проста выпырхне і пачне распраўляць свае пёркі. Не памятаю, каб нехта хацеў патрапіць, спрабаваў нешта ёй адказваць, і яна яму нешта казала. Яна гаварыла сама па сабе. Пазней я зразумею, што Таня ўжо некалькі гадоў сама сябе як бы замаўляе пасля смерці любімага мужа.

Цікава было тое, пасля таго, як яна была ўжо на зямлі, калі мы прыехалі да вядомых мастакоў. О! Гэта было ейнае асяроддзе! Яна хадзіла, лётала назад- наперад па майстэрні. Зноў гаварыла, гаварыла,



Фота www.outdoorpainter.com

шчабятала, хадзіла ад адной карціны да другой, дзясятай, — і здавалася, што яна сама гэтыя карціны намалявала! І яна ўсё запрашала, усіх запрашала пасядзець, пагаварыць. Увесь час звярталася, увесь час звязвала ўсіх нас, счапляла. Ёй хацелася гаворкі, размовы, шчэбету, уражанняў. Калі ў чарговы раз яна нешта распавядала нам пра свае выставы, пра свае пленэры, якія робіць, мне здаецца, для кожнага, не зважаючы, ці меў ён калі-небудзь імя, ці ведаў яго хто-небудзь пры жыцці, ці шанавалі, акрамя сяброў. Мне здавалася, яна трымае ў руках, як абраз, фотаздымак ужо даўно забытага мастака і няспешна нясе яго праз увесь горад, нібыта робячы яму выставу. Ёй хацелася, каб кожны быў на памяці, яна вельмі блізка ведае, што такое стварыць на палатне свой свет (муж быў мастак)!

Так я і бачу яе: яна стаіць, нешта распавядае — і такое намаганне: саступае з нагі на нагу, пераступае на пальчыкі, зноў вяртаецца на пятку, зноў на пальчыкі. І ўвесь час нейк падаецца ўперад, хочучы, каб яе ўсе зразумелі і пачулі, а на самой справе — яе карцела патрэба, яна рыхтуецца ўзляцець! Яна пільнуе вецер — у які бок яе панясе, на клады даўно забытага мастака ці на яго выставу.

Толькі трэба было адчыніць ёй акно.

Яна ўжо распраставала крылле.

***

Мне спадабалася паштоўка з карцінай Мадзільяні, і я захацела атрымаць яе копію. Я ўбачыла дом, падобны на крэпасць, я адчула ягоны лёс. Дом стаяў на беразе вялікай вады, буйныя кроплі на сценах, як на целе ад напружання ці ад хваравітасці, а магчыма, гэта была проста марская вільгаць. Каля падножжа ўжо падымаўся мох, спрабаваўся падняцца. Здавалася, што дом пусты, што ён нежылы, але нечакана заўважаеш яшчэ жывое, ружаватае адценне на сцяне, магчыма, ад сонца, ці гэта ўнутранае святло? Адразу здагадваешся, што дом яшчэ жывы. Магчыма, яму вельмі цяжка, яму надакучыла стаяць на гэтым месцы. І яму захацелася сысці туды, дзе сушэй. Відаць сходкі і сцежку. Сходкі то падымаліся, то апускаліся ўніз. Шыбы ў акне не блішчэлі, не было відаць зрэнак. Цёмнае, цёмнае акно. Настолькі дом быў падобны на старога чалавека, які ўжо нажыўся, але ў той жа час нейкая згадка, нейкая вестка была з акна, з левіцы, з дзвярэй наверсе, што ён яшчэ хацеў жыць. Поруч стаяла дрэва, і нікога нідзе не было. І чалавека ўбачыць немагчыма. Дом жыў сам па сабе. А дрэва побач, быццам адзіны яго сусед. Так заўсёды: мы садзім дрэва ля дома. Дзеля чаго? Мне здаецца, што гэтае дрэва патрэбна не толькі чалавеку, а менавіта самой хаце, самому дому, самой крэпасці, каб пада́ць знак, што ён жывы, што ён не адзінокі. Мне захацелася мець копію гэтага дома. І праз вулачку выдавалася плячо суседняга дома, таксама стромкага, цяжкога, каменнага, так хацелася ўбачыць, што гэта за ён? Але гэта было немагчыма, трэба было толькі прыдумаць. Мне захацелася мець гэты дом-крэпасць, захацелася атрымаць копію. Я замовіла яе знаёмаму мастаку, якога мне рэкамендавалі як добрага капіроўшчыка, зрабіць гэтую работу.

І ён прынёс. Я была ў шоку, у мяне адабрала мову, я анямела. Мне здавалася, што я нападу на яго, як робяць дзікія людзі ці лучнікі, што найперш мая прырода змушвае — ухапіцца за стралу! Там стаяў зусім інакшы дом. Там быў фанерны. Такія робяць звычайна кіншчыкі, а потым разбіраюць пасля здымак, адным пальцам разбураюць. Я паспрабавала супакоіцца і патлумачыць яму, але ён не разумеў. І тое, што ён не разумеў, што змярцвіў дом, ён пачаў тлумачыць, злавацца, маўляў, можна зрабіць і так і гэтак. Я казала, што нас тут трое. «Хто трэці?» — пытаўся ён.

– Нас двое і Мадзільяні! Ты не маеш права яго перапісаць, ты ня можаш змярцвіць гэты дом. Ты ня меў такога права!

Я кідалася раз'юшана, не пазнаючы самую сябе. Для мяне мастак заўсёды быў нечым асаблівым, асабовым, нешта такое... Я зайздросціла таму, хто ўмеў маляваць, і цяпер, калі я губляла зрок, я разумела, што марыць пра маляванне ўжо не змагу...

Мы разышліся. Мы не пасварыліся, мы разышліся назаўсёды.

Аж нечакана зноў аказаліся ў адной кампаніі. Ён сядзеў насупраць, на ім была новая кашуля, але надзетая як не сваімі рукамі, быццам яго нехта апранаў (не раўнуючы як нябожчыка). Ён сядзеў сівы, шмат гаварыў, як ніколі, я была насупраць, слухала, і мне гэта не перашкаджала, не псавала настрой. Я ўжо не памятала, што ён няўдалы капіроўшчык. Ён нечакана пастарэў, трапіў у кола маіх любімых людзей — дзяцей і старых, як бы яны ні выглядалі і што б яны ні рабілі. Я заўсёды іх шкадую — і тых і другіх.

Праз хвіліну-другую, ужо развітваючыся, ён падняўся першым з-за стала. На маёй талерцы яшчэ заставаўся дранік. Ён па-птушынаму лёгка, пікіруючы як вялікая птушка, схапіў гэты дранік і хуценька з'еў. І знік. У мяне было адчуванне, што, магчыма, для кагосьці ён паляцеў капіраваць непаўторнага Шагала...

Я сядзела і адчувала даўно забытую блізкасць гэтага чалавека, якой у нас ніколі не было, быццам мы даўно елі з адной талеркі і кармілі адзін аднаго сваёй лыжкай!

2019

Для мяне мастак заўсёды быў нечым асаблівым, асабовым, нешта такое... Я зайздросціла таму, хто ўмеў маляваць, і цяпер, калі я губляла зрок, я разумела, што марыць пра маляванне ўжо не змагу...

Захавацца



Анатоль ІВАШЧАНКА

* * *

горад — суцэльны корак
горад — сапраўдны хорар
горад завецца Гамора
горад завецца Мордар
горад канае ад смагі
горад — логава Смаўга
горад атручаны смогам
горад хаваецца ў змроку
горад тоне ў мане
ў быкаўскім тумане́
ў кінгаўскім тумане́
у тумане Манэ
горад зрывае голас
горад галёкае: гооолем
тут хаваецца голум
тут гаспадарыць гоблін
гораду сняцца горы
горад чытае Оруэла
горад-бярлог-пячора
фота ў вакне-маніторы
горад — скрынка Пандоры

Захавацца

Ранкам 27-га дня чалавек
выйшаў з сябе.
Больш у сябе ён не вярнуўся.

Захавацца.
Дажыць да вясны.
Дагартаць
пералётныя сны.*
Дапаліць
недапалены золак.
Дапісаць
кулямётнае сола.
Перабіць
усе стрэлкі, парогі, паролі.
Даіграць
зненавідную ролю.
Выйсці вонкі
з сябе.
Й не вярнуцца
туды больш ніколі.

* Назва нізкі вершаў Наталлі Русецкай

* * *

Восень. Пісаць лісты.
Восень. Паліць масты.
Восень. Глядзець у прыцэл.
Восень. Baileys & дзэн.
Восень. Аб шыбы біцца.
Восень — бажніца ці шыбеніца?
Восень. Схавацца ў лісці.
Восень. Прасіць аб літасці.
Восень. Скрыпень ды Боб.
Восень. Лі Бо & Рэмбо.
Восень. Мёд ды імбір.
Восень. Віскі & Beer.
Восень. Паліць лісты.
Восень, сёстры й браты!

Прамова Б. Тарашкевіча

«Да парадку, браты!
За фіранкамі самая поўнач.
У калюмнах пануе маўчаньне.
Устаньма ў ланцуг.
За фіранкамі ноч.
За дзьвярыма трывожна і цёмна…
Але сьветла у душах
і цёпла ад поціску рук.

Час ісьці, захаваўшы ў таемнасьці
нашу сустрэчу.
Разрываем ланцуг нашых рук,
але сэрцаў — ані.
Нас агорне смуга й цені горада
лягуць на плечы.
Ды ў паходнях вачэй не загаснуць
братэрства агні».

Пасля бяссонае Ночы
будзе вялікі Дзень.
Божа, расплюшчы нам вочы.
Божа, дазволь нам глядзець.

Вільня, 25.05.1919

Пра пачэсванне ПУЗа

З юнацтва абвешчаныя геніяльнымі,
абвешаныя найвышэйшымі
ступенямі параўнання,
з непахіснаю вераю ў сваю
адметнасць,
нясуць яны свой Дар,
нібы хрустальны сасуд,
баючыся расплёскаць ці разбіць.
Здымаюць, друкуюць,
папулярызуюць,
атрымліваючы заслужаныя
ўзнагароды
за свой вялікі ўнёсак
у Нашую Агульнаю Справу.
І рухаюць, рухаюць, рухаюць
НАС наперад.
Калісьці, разам з залікоўкамі,
прыносілі яны выкладнікам
свае дэбютныя кнігі вершаў
з зарыфмаванымі аўтографамі.
(Дарэчы, пілі яны зусім не кефір,
адрозна ад жаданаўскіх
харошых маладых паэтаў).

Бязверныя, празмерна
недаверлівыя,
халодныя мізантропы
ды сацыяпаты,
назіраем за іх поспехамі,
за пачэсваннямі ПУЗ.*
Яны не сумняюцца ў святасці
свае місіі.

Назіраем.
Маўчым.
Увесь час сумняемся.

* Пачуццё ўласнае значнасці.

Кантрабас

Калі знішчаны дашчэнту
ўвесь забугорны кантрабас —
кракаўскія кілбаскі,
віленскае вэнджанае сала,
слоічак харвацкіх аліваў,
апошні пачак аўстрыйскае кавы,
моцарткугель ды птушынае млечка…
Калі струшчаны пратэрмінаваны
кавалак дар-блю,
выпітая апошняя пляшка
д'ютыкаўскага егермайстра,
спаленая рэшта праскага абсэнту
(не кажучы пра слівовіцу
ды травары́цу)…
Калі шэнген скончыўся заўчора
й наступны
невядома калі прадбачыцца…
Тады —
агортвае разуменне поўнага
й беспаваротнага капца,
Які Is Coming.
Халоднае вечка цынкавага неба
насоўваецца,
адкрываючы падабенства
гэтага горада
з дамавінай.
Снег, што густа абклаў наваколле,
набывае абрысы кратаў.
Бессэнсоўнасць кідання вершаў
на вецер
афармляецца ў аксіёму…
Тады разумееш,
колькі ж дзівосных месяцаў
ты яшчэ не наведаў
у сваёй роднай Сінявокай!

чорная сутра

той хто змог убачыць сябе
па-за сабой
наўрад ці павядзецца
на танныя коміксы
пра планету як вязніцу
і канвой з анёла-ахоўніка
за спінай.
той хто меў патрыманую
«бэху»
ужо не перасядзе нат у новы
красовер
вытворчасці тальяцінскага
аўтазавода.
той хто кахаў каралеўну
ніколі не будзе жыць у законным
шлюбе
з надзіманай гумовай лялькай.



Фота Зянона Пазняка

* * *

пацягуўся па аловак
каб падкрэсліваць хібы
ў тваім зборніку вершаў
але збег ад мяне аловак
выслізнуў з пальцаў
даў нырца пад канапу
толькі асадка ў зоне дасяжнасці
ды нататнік —
той самы
куды цяпер занатоўваю…
а мог жа перакрэмзаць
твой зборнік вершаў
пападкрэсліваць стылёвыя
неахайнасці
розную трасцу…
пашэнціла табе, даражэнькая,
гэтым разам

37-е лета

Пракрочвае міма мяне
трыццаць сёмае лета.
З-за плоту даносяцца спевы
безгалосых манкуртаў.
І вось мае крылы і воск,
а вось мая клетка.
Пад спеў гэты курчацца рэшткі
Летава, Цоя і Курта.
Гадую сваю бараду-бараду-бара-
ду ад дубару,
рудую сваю бараду
гадую.
Струну нацягну
выйду з ступару і
прарасту сярод флуду.
Збудую сцяну,
дацягнуся да тых,
хто ў вежы жыве і не ве-
дае гэтага бруду.


Крочаць-крочаць паўз мае сны
партызанкі вясны
прадвесцем вайны.
Крочаць сляпыя кентаўры
з гітарамі
рок-дыназаўры прабоіны ў аўры.
Хочуць сурочыць
сусед караочыць,
як тут пераночыць
да заўтра?!
Вось мае крылы і воск
малітва і вось —
пагарда.

Гадую…

Mr. Flood

містэр тамбурын
місіс рабінзон
капялюш стары
новы парасон
бедны маласэн
добры мапасан
мёртвы кім ір сэн
свежы круасан
вечны керуак
рэзрух у мазгах
шчэ радок і ў бан
хлопчык бананан
чакаляды смак
мандарыну пах
на каляды цуд
dear mister flood

Ленін мост



Мікола ІЛЬЮЧЫК

Я не аднойчы бачыў той мост. Нават колькі разоў праязджаў праз яго, едучы ў бок Слуцка. Стаіць сабе, такі ахайны, дагледжаны і нават прывабны, калі так можна сказаць пра звычайнае «тыповае збудаванне».

Аднойчы знаёмы кіроўца прамовіў няўзнак: «Неяк мы спыніліся адразу за Леніным мостам. Там яшчэ такі добры пляц на ўзбочцы, адстойнік для дальнабояў». Ён удакладніў, паміж якімі населенымі пунктамі той мост знаходзіцца, і дадаў: «Ну што ты, хіба не ведаеш? Сам жа колькі разоў там быў».

Быў-то быў, але мяне зацікавіла назва. Калгасы, вуліцы, бібліятэкі, нават гарады назвалі ў гонар правадыра пралетарыяту. Але каб мост! Дзіва нейкае! Увогуле не чуў такога, каб у нашай краіне масты мелі назву. Таму я быў здзіўлены і разлабаваны адначасова.

— Здурэлі зусім, мост у гонар Леніна назвалі!

— Ты што, які Ленін?! У гонар Ленкі, што яго будавала, — кіроўца гучна рассмяяўся з маёй недасведчанасці.

— Што яшчэ за Ленка?

— Алена Уладзіміраўна, яе маладым спецыялістам накіравалі ў наш трэст. Прыгожая была дзеўка, я табе кажу, халасцякам нашым спакою не было ад яе. Як мухі на мёд, ляцелі, умела прывабіць.

— А потым што, як склаўся яе лёс? Мост стаіць, а з ёю што?

— Ты ж не малы, павінен разумець, што ад вялікага кахання з'яўляюцца дзеці. Так і з ёю. Кахалі многія, а бацькам стаць ніхто не захацеў. Падгадавала яна сыночка да гадочка — і ўзнагародзіла старых, але яшчэ моцных бацькоў не ўнукам, а быццам бы сынам прыёмным. Але гэта так, людзям на язык…

У наш трэст Ленка болей не вярнулася. Дзесьці ў райкаме пасада знайшлася, і пачала Алена Уладзіміраўна рухацца па партыйнай лесвіцы. Усё жыццё, як кажуць, на кіраўнічых пасадах. Дэпутаткай была. Я сам колькі разоў звяртаўся да яе, дапамагала па старой памяці, выручала, не адмовіла…

Мой суразмоўца яшчэ доўга агучваў нейкія падрабязнасці, але тая размова так і засталася проста шараговай балбатнёй ад нечага рабіць, каб толькі змарнаваць час. Але праз колькі гадоў мне давялося ўзгадаць пра тую размову.

Неяк на адной калялітаратурнай тусоўцы ў гарадской бібліятэцы суседняга райцэнтра заўважыў жанчыну ўжо сталага веку, але яшчэ з нястрачанымі прывабнымі рысамі. Яна і ў такім узросце была прыгожай і дзесьці нават шыкоўнай. Вечарына скончылася, і яна сама падышла да мяне, сказала, што чытала мае творы, і выказала жаданне набыць маю кнігу.

— Каму падпісваць? — пацікавіўся я.

— Алене Уладзіміраўне, — ціха прамовіла мая прыхільніца і назвала прозвішча.

Мяне быццам токам працяла. Ці можа быць такое супадзенне? Але як запытацца, каб не пакрыўдзіць?

— Алена Уладзіміраўна, а хто вы па адукацыі і адкуль такая цікавасць да літаратуры?

— Літаратуру люблю, і не толькі яе. Увогуле, я бываю амаль на ўсіх культурных мерапрыемствах, што ладзяцца ў нашым горадзе. Адукацыя мая далёкая ад усяго гэтага, я інжынер-дарожнік. Будавала масты, дарогі…

— Прабачце, а Ленін мост на Слуцкай шашы — ваша работа?

— Мая, — Алена Уладзіміраўна няёмка ўсміхнулася, — хлопцы з нашага трэсту жартаўнікі былі яшчэ тыя, вось і прычапілася тое «Ленін»…

Праз нейкі час мы сустрэліся яшчэ. Былі тэлефонныя размовы і сталае ліставанне. Потым нашы стасункі сталі прыяцельскімі і нават сяброўскімі.

Потым адбылася неспадзяванка. Прычым непрыемная. Алена Уладзіміраўна захварэла. Цяжкая хвароба прывяла яе да своеасаблівага ступару. Доўга не было ані тэлефанаванняў, ані лістоў. Але аднойчы я з задавальненнем дастаў з паштовай скрынкі капэрту са знаёмым почыркам. Алена Уладзіміраўна, хоць была досыць эмацыйным чалавекам, вельмі стрымана напісала пра ўласную хваробу і прасіла прыехаць. У бліжэйшы выхадны мы сустрэліся.

— Ведаеш, Колечка, у мяне няма нікога бліжэйшага за цябе. Стрыечны брат далёка, сястра, таксама стрыечная, яшчэ далей. Ды ім няма ніякай справы да мяне, бо, кажучы шчыра, і мне да іх ніколі не было ніякай цікавасці. А той, прыёмны, што гадавалі бацькі, быццам з глузду з'ехаў. Не хочу нават узгадваць… У мяне просьба да цябе.

— Якая?

— Паедзь, калі ласка, са мной у бальніцу, так трэба. Ты ж не адмовіш жанчыне?

— Чаму б не? Калі трэба, то трэба.

Праз паўгадзіны мы былі на месцы. Сумныя людзі ў бальнічным калідоры выглядалі прыгнечана. У ардынатарскай сядзеў маладжавы доктар.

— О, Алена Уладзіміраўна, вітаю. Што здарылася? Вы да мяне сёння без запрашэння, — анколаг шчыра ўсміхнуўся.

— Прывітанне, Іван Іванавіч! Я да вас з сур'ёзнай справай. Я прашу, калі ласка, пазначце імя і прозвішча гэтага чалавека, а таксама ягоны нумар тэлефона. Гэта самы блізкі мне чалавек, мы даўно сябруем. Калі са мной здарыцца нейкая неспадзяванка, то вы будзеце ведаць, каму патэлефанаваць.

— Але ж, Алена Уладзіміраўна, я павінен ведаць, ці сам ён згодны на такое. Не падзяляю і вашага песімізму, бо лячэнне вашае ідзе досыць паспяхова…

— Не, я не супраць, — больш чым стрымана адзначыў я.

Мы развіталіся з доктарам і паехалі дадому да Алены Уладзіміраўны. Сядзелі на кухні, пілі гарбату і размаўлялі. У асноўным гаварыла яна пра сваю сумную будучыню. Алена Уладзіміраўна запэўнівала, што яна падрыхтаваная да ўсяго, і грошай хопіць і на труну, і на памінальны стол, і на помнік.

Наступным разам прапанавала з'ездзіць на могілкі, каб паказаць месца, што падрыхтавала загадзя, побач з бацькамі-нябожчыкамі, што сыйшлі ў лепшы свет з дзясятак гадоў таму.

— Алена Уладзіміраўна, можа, хопіць гэтых размоў? Доктар сказаў: хвароба ваша вылечная, і ўсё будзе добра. І я ўпэўнены ў гэтым.

— Колечка, я ж не супраць. Няхай усё будзе так, як ты кажаш, але трэба быць абачлівым. Прабач, але прымі гэта як маленькі жаночы капрыз. Усё жыццё я дбала пра сябе сама і хачу быць падрыхтаванай літаральна да ўсяго.

— Але чаму я павінен усё гэта выслухоўваць?

— З мужчынамі мне ніколі не шанцавала, бадай што, акрамя цябе, — яна ўсміхнулася.

— Не крыўдуй, гэта проста сяброўская просьба. А сцэнар я дашлю табе пазней.

— Які яшчэ сцэнар?

І сапраўды, не прайшло і тыдня, і ліст ад яе я ўсё ж атрымаў. Узяўшы ў рукі тоўстую, з мноствам марак, капэрту, здагадаўся, што там менавіта той абяцаны сцэнар. З дзясятак лістоў, з абодвух бакоў спісаных дробным почыркам, патрэбна было прачытаць не тэрмінова, але цікаўнасць узяла верх: пачаў чытаць адразу.

Алена Уладзіміраўна даслала сцэнар уласнага пахавання.

Выдаткуйце хоць невялікую частку з таго, што ў вас ёсць, на лекі, на вітаміны, паедзьце на адпачынак у рэшце рэшт. Нельга ж так жыць, каб кожны дзень думаць пра пахаванне, каб яно было не горшым, чым у людзей. А калі і горшым, то што з таго?

Усё пачыналася з вопраткі, якую яна прыгатавала загадзя. Было пазначана, дзе ляжыць той клуначак, што сабрала ў сваю апошнюю зямную дарогу. Нават паклапацілася пра ўпрыгожванні.

Далей у лісце змяшчаўся спіс людзей, дарэчы, досыць вялікі. Гэта тыя людзі, якім патрэбна было паведаміць, што яе (для некага — Алены, для некага — Алены Уладзіміраўны, а для некага, не гледзячы на ўзрост, — проста Лены) больш няма на гэтым свеце. У паведамленні патрэбна абазначыць чысло і час пахавання. Насупраць кожнага імя быў пазначаны кантактны нумар тэлефона.

Алена Уладзіміраўна паведамляла, што ў кафэ, недалёка ад яе дома, можна зрабіць памінальны стол для вышэйазначаных асоб. «Грошай хопіць, на ўсё хопіць, — пісала яна, заканчваючы гэтым выразам амаль кожны абзац, — не хвалюйся».

Далей у сваім лісце Алена Уладзіміраўна паведамляла, што наведала некалькі рытуальных кантор, нагледзела труну, добрую і не надта дарагую. Тут жа быў пазначаны адрас і тэлефон фірмы, што займаецца такімі спецыфічнымі паслугамі.

Апошнія рэкамендацыі і пажаданні былі наконт святара. «Хоць я і камуністкай была, але ж аркестры ў наш час — гэта маветон, — пісала Алена Уладзіміраўна, — паклічце нейкага папа, за невялікія грошы адпяе, і будзе ўсё, як у людзей».

Усё, што яшчэ не напісана ў гэтым лісце, Алена Уладзіміраўна абяцала давесці пры сустрэчы. Што яшчэ? Што там яшчэ можа быць, калі нават час ад'езду рытуальнага аўтобуса пазначаны, засталося толькі дату ўставіць! Вось дык падыход! Мне было і смешна з такой абачлівасці, і сумна ад таго, што чалавек псуе сабе астатак жыцця, замест таго, каб проста жыць і насалоджвацца кожным адмераным днём. Але я прычым? Навошта мне гэта ўсё?

Адказы на мае пытанні дала сустрэча, што адбылася напрыканцы сакавіка. Алена Уладзіміраўна патэлефанавала і запыталася, ці магу прывезці ёй бярозавіку, хоць бы літраў з дзесяць. Чаму б не?! Паставіў у легкавік біклагу на сорак літраў і паехаў, прыхапіўшы той шэдэўр эпісталярнага жанру ў таўсматай капэрце.

— Ой, Колечка, навошта так многа бярозавіку прывёз, мне да канца жыцця столькі не выпіць, — замест прывітання прамовіла Алена Уладзіміраўна.

— Вып'еце, куды вы падзенецеся! Наступным годам зноў прывязу. Калі трэба, то кожную вясну буду вам яго вазіць.

— Але што ты кажаш такое? Ты што, не атрымаў мойго ліста?

— Атрымаў, Алена Уладзіміраўна, дурнота ўсё тое, што вы там напісалі.

— Як ты можаш такое казаць, я такая хворая, а ты яшчэ кпіш з мяне!

— Не вам вырашаць час зыходу. Не дадзена ведаць ні вам, ні мне, ні каму іншаму з людзей. А хвароба ваша не да скону. Жыць будзеце, і не мала. Я гэта дакладна ведаю. І паперы вашы… вось яны, парвіце на дробныя шматкі і выкіньце ў сметніцу.

— Колечка, але ты адзіны чалавек, якому я давяраю. Я ж думала, што менавіта ты паклапоцішся пра мяне тады, калі я сама нічога ўжо не змагу для сябе зрабіць. Глядзі, грошы ў мяне ёсць. На ўсё хопіць.

Яна дастала з шафы нейкія паперы, кінула стос на стол. Пакорпалася ў паліцах і дастала таўсматы пакунак наяўных. Грошы былі перавязаны яркай стужкай.

— Вось, гэта валютны ўклад у адным банку, — яна нервова перабірала нейкія цэтлікі, — гэта ў другім, а гэта ў нашых грашах. А тут бачыш, колькі?..

— Але ж хвароба ваша лечыцца. Лепш выдаткуйце хоць невялікую частку з таго, што ў вас ёсць, на лекі, на вітаміны, паедзьце на адпачынак у рэшце рэшт. Нельга ж так жыць, каб кожны дзень думаць пра пахаванне, каб яно было не горшым, чым у людзей. А калі і горшым, то што з таго? І чаму для вас важнае меркаванне нейкіх там абстрактных людзей? Прабачце, але ці часта вы лічыліся з меркаваннем людзей, калі проста жылі, недзе вучыліся, працавалі?

— О, тады я жыла! Асабліва ў той час, калі перастала будаваць масты. У мяне такія сувязі былі, такія знаёмствы. Любое пытанне магла вырашыць па адным званку! Словам, «блатняк». Дарэчы, ты ж абяцаў мяне на могілкі звазіць. Я павінна табе месца паказаць, заадно і да бацькоў загляну. Два гады там не была. Там даўно не хаваюць, але ж некалі «па блату» аслупавала месца і для іх, і для сябе. Праўда, там была адна брыдкая гісторыя, потым раскажу. Дык што, паедзем?

— Паедзем, — без асаблівага імпэту вымавіў я.

На старых гарадскіх могілках ані душы. Я ездзіў па адным прагале, па другім, а яна ўсё не магла дакладна вызначыцца, дзе знаходзіцца тая мясціна. Відаць, і сапраўды даўно не была, сцерлася з памяці. Потым папрасіла спыніцца.

— Ідзі, нешта пакажу, — яна падвяла мяне да нейкага, на мой погляд, неймаверна дарагога помніка, — хачу такі, замовіш для мяне?

— Алена Уладзіміраўна, гэта цэлая скульптурная кампазіцыя, я нават не магу ўявіць, пра якую суму тут можа ісці гаворка.

— Не турбуйся, у мяне на ўсё хопіць! Далей пехатой пойдзем. Я зразумела, дзе мы, адсюль ужо недалёка.

Яшчэ досыць халодны вясновы вецер нехаця калыхаў голле рэдкай расліннасці. Каменне і штучныя кветкі як напамін, што тут няма месца для жыцця, наводзілі на сум. Але раптам недзе ў гары гучна заспявалі птушкі: вясна ўсё ж, як-ніяк.

— Вось мае тата і мама. А гэта месца для мяне, — яна паказала на вольную дзялянку. — Добра тут, ты згодзен?

Я паглядзеў на лапік паміж магіл. Чатырохкутнік з аселай глебай сярод зеляніны навёў на думку, што тут раней ужо была магіла. Са здзіўленнем пагледзеў на Алену Уладзіміраўну, і яна, не чакаючы маіх пытанняў, сама загаварыла.

— Бач, нахабнікі! Пайшла на пенсію, выпала з абоймы, думалі — усё, можна рабіць, што заўгодна. Занялі маё месца. Але я навучыла іх як след! Эксгумацыю зрабілі па рашэнні суда, я дамаглася. Яшчэ і грошы спагнала за нанесеную мне маральную шкоду… Мне прапаноўвалі іншае месца, нават некалькі, на выбар. Але я паказала ім, хто ёсць хто!

На зваротным шляху мы амаль не размаўлялі. Пра што


Фота www.ranak.by

гаварыць? Было непрыемна, што чалавек, які падрыхтаваў сцэнар уласнага пахавання, яшчэ здольны нешта некаму даказваць...

Праз тыдзень я атрымаў чарговы ліст. Алена Уладзіміраўна спрабавала нешта тлумачыць пра выпадак з могілкамі, пра суд. У нечым згаджалася са мной, у асноўным з тым, што людзям усё ж не дадзена ведаць пра дзень і час зыходу з зямлі. Але ж, сцвярджала Алена Уладзіміраўна, калі той сумны дзень надыдзе, то патрэбна, каб усё было не горш, чым у людзей. Да ліста быў прыкладзены новы спіс тых, каму варта паведаміць сумную навіну аб тым, што з жыцця пайшла Алена Уладзіміраўна. Дзіўна, але ў параўнанні з папярэднім ён быў скарочаны амаль на траціну. Мяркую, што другі сцэнар усё ж меў намер скараціць выдаткі.

Напрацягу некалькіх гадоў нашы зносіны адбываліся ў асноўным праз лісты, радзей па тэлефоне. Чамусьці мне не падабалася размаўляць з Аленай Уладзіміраўнай. Тым больш, што мабільнага ў яе не было, і я ведаў, у якую капейчыну вылятаюць нашы размовы. На лісты адказваць было мусова. Па магчымасці спрабаваў даваць ёй нейкія парады, але часцей усе мае намаганні былі дарэмнымі.

Алена Уладзіміраўна ачуняла ад хваробы, яе нават з уліку знялі. У кожным лісце паведамляла пра свае вандроўкі, пра экскурсіі, публікацыі ў мясцовай прэсе, пра сустрэчы з літаратарамі ды іншымі цікавымі людзьмі.

Я выказваў сваё шкадаванне з тае нагоды, што яна так і не вызначылася з канфесіяй. Але Алена Уладзіміраўна была катэгарычнай і сказала, што гэта для яе зусім не актуальна. Я нагадаў ёй старую прымаўку: «Як трывога, дык да Бога...». Але Алена Уладзіміраўна адказала нейкім не надта прыстойным жартам.

Потым было яшчэ некалькі сустрэч, але гэта не былі, як раней, сустрэчы сяброў ці аднадумцаў. Паміж намі ўзнікла пэўная дыстанцыя недаверу і стрыманасці. Але ж пры кожнай сустрэчы яна нястомна выказвала мне свае меркаванні па той жа непрыемнай тэме. Мне надакучыла выслухоўваць яе трызненне. Бязглуздзіца нейкая, не інакш. Але з павагі перад старасцю слухаў і нават запэўніваў сябе, што калі патрэбна будзе нешта такое рабіць, то мушу. Зраблю, куды ж я падзенуся...

Быў лютаўскі марозны надвячорак. Я вяртаўся з працы. У салоне машыны гучала лёгкая музыка. Па заснежанай дарозе зрэдку праязджалі сустрэчныя аўтамабілі, уздымаючы віхуры снегу. Гэта вымушала быць абачлівым.

Раптам патрабавальна азваўся тэлефон. Магчымасці спыніцца не было, і я вырашыў не браць слухаўку. Хто ведае, што там на заснежанай узбочыне? Лепш потым перазваню, падумаў я, але тэлефон скуголіў беспярэпынна, патрабуючы адказу.

— Прывітанне, Міколка!

Гэта была Алена Уладзіміраўна, хоць голас быў зусім слабы. Можа, захварэла, а можа, проста сувязь недасканалая.

— Прывітанне, Алена Уладзіміраўна! Як вы? Што здарылася?

З папярэдняга досведу ведаючы, што размова не будзе кароткай, рызыкуючы мажлівасцю захраснуць тут надоўга, я з'ехаў на ўзбочыну. Звонку завываў вецер — правіла свой баль завіруха. Моцны віхор уздымаў клубы снегу і шпурляў на лабавое шкло.

— Колечка, я вырашыла пазваніць, бо, мабыць, больш не будзе ўжо такой магчымасці.

— Як так, Алена Уладзіміраўна? Што такое?

— Мабыць, гэта ўсё...

Я зразумеў, што маецца на ўвазе, і хацеў неяк падбадзёрыць яе, але патрэбных слоў не знайшлося, а яна працягвала гаварыць.

— Ляжу ўжо другі тыдзень, — я зразумеў, што кожнае вымаўленае слова даецца ёй з цяжкасцю, — але гэта не вяртанне старой хваробы, проста надыходзіць мой час. Я памятаю, як ты некалі казаў мне, што памру ад старасці. Гэта акурат тое...

— Але чаму вы не сказалі раней? Мы б прыехалі да вас, нечым дапамаглі, а можа, нават да сябе забралі б, вам жа догляд патрэбен. Паправіцеся яшчэ.

— Што сказаць... Мяне даглядаюць, нават добра даглядаюць. Сястра стрыечная з дачкою па чарзе сядзяць са мною. А што мне патрэбна? Вусны вадой намачыць. Ежы ніякай не бяру чацвёрты дзень. Мой жывот нарэз адмовіўся ад харчавання. Колечка, і ты, і я ведаем, што гэта азначае. Але ты не думай, я нічога не баюся. Больш таго, я павінна сказаць табе нешта важнае, пакуль побач са мной няма нікога. Але паабяцай, што гэта застанецца толькі паміж намі...

— Абяцаю, кажыце.

— Ведаеш, недзе месяц таму я ўсё ж знайшла тых людзей.

— Якіх людзей?

— Я табе расказвала неяк пра месца на могілках, пра суд і ўсялякія непрыемныя рэчы...

— Так, я памятаю. І што?

— Яны мяне выслухалі і нават зразумелі. Мяркую, што прабачылі, бо пагадзіліся ўсё ж узяць грошы, якія я ім прапанавала, як кампенсацыю, за спагнанае судом.

— О, гэта сапраўды цудоўная навіна. Добра, што вы іх знайшлі і выбачыліся перад імі. Віншую, гэта сапраўдны ўчынак.

— Колечка, я і ў цябе хачу прасіць прабачэння.

— А ў мяне за што, Алена Уладзіміраўна? Мы ж з вамі ніколі не сварыліся...

— Не, хлопчык мой... Ты меў рацыю, і я цяпер гэта ведаю дакладна, не ты будзеш кіравацы тымі сумнымі справамі, што я табе некалі даручала. Знайшліся сваякі. Прабач, што так атрымалася.

— Алена Уладзіміраўна, якую палёгку вы мне зрабілі, каб вы толькі ведалі.

— Але паабяцай, Колечка, што ты прыедзеш, каб развітацца са мной назаўсёды, каб справадзіць мяне ў апошні шлях.

— Так, Алена Уладзіміраўна, я заўтра да вас прыеду!

— Не, не трэба. Прыедзеш потым. Можа, нешта і скажаш для людзей. А можа нехта з мясцовых літаратараў таксама добрае слоўца знойдзе для мяне: я любіла бываць на іх мерапрыемствах, падтрымлівала. Колечка, табе абавязкова паведамяць пра тое, прыедзеш?

— Алена Уладзіміраўна, ну і пытанні ў вас!.. — мне хацелася яе неяк падбадзёрыць, але слоў не знаходзілася.

І я, і яна дакладна разумелі, што гэта наша апошняя размова. Больш яна мне не пазвоніць і на маё тэлефанаванне не адказа. Усе словы сказаныя, а цяпер яна хоча пачуць ад мяне адно толькі слова. Паўза зацягнулася.

— Колечка, прабач, калі што было не так, але я прашу: прыедзь. Вяртаецца мая пляменніца, больш не магу гаварыць.

— І вы мне прабачце, я прыеду, Алена Уладзіміраўна, я абавязкова прыеду!

У тэлефоне манатонна запіпкала. Добра, што я паспеў сказаць ёй гэтыя словы. Добра, што яна паспела іх пачуць.

Я ачомаўся ад холаду. Не ведаю, колькі часу я так сядзеў, але машына выстыла канчаткова. Пра нешта думаў, нешта ўзгадваў, нават плакаў ад шкадавання. Мабыць, развітальныя слёзы заўсёды дарэчы, асабліва калі развітанне назаўсёды. У такія моманты хочацца плакаць, але найчасцей слёзы ўтрымліваюцца нейкімі неймавернымі высілкамі. А тут ніхто не перашкаджаў, і мае слёзы бачыў хіба толькі снег, што біўся ў шыбу. Але ён нікому не раскажа. Вечаровы снег умее захоўваць таямніцы.

А роўна праз тыдзень, такім жа зімовым вечарам, зазваніў тэлефон. Жаночы голас без аніякіх эмоцый стрымана паведаміў: «Памерла Алена Уладзіміраўна, пахаванне адбудзецца заўтра».

Раніцай, з агромністым букетам барвовых ружаў, балазе кветкавы шапік на суседняй вуліцы, я падняўся ў кватэру нябожчыцы. Працяла дурная думка, што Алена Уладзіміраўна легла ў труну, каб усе толькі паглядзелі, ці добра яна выглядае. Бо выглядала сапраўды добра. Ёй пасавалі тыя ўборы і прыкрасы, што так дасціпна яна рыхтавала дзеля такога адказнага моманту. Ля труны сядзела нейкая жанчына ў чорным, а па кватэры снавалі яшчэ некалькі чалавек. Акрамя нябожчыцы я нікога не ведаў, таму кветкі нікому аддаваць не стаў, а паклаў у труну побач са штучнай лілеяй ненатуральнага кіслотнага колеру.

Стаяць ля труны ў атачэнні зусім незнаёмых людзей — справа не з прыемных. У двары, ля пад'езда, было неяк спакайней. Выглянула сонейка. Яно старалася, і з ледзяшоў, што віселі на ўскрайку даху, нават упала некалькі кропель. Пачалі збірацца суседзі і тыя, каму, я так мяркую, паведамілі згодна загадзя прыгатаванага спісу. Я падышоў да невялікай купкі тутэйшых літаратараў. Усё ж яны малайцы, што прыйшлі. Стаялі, размаўлялі ажно да таго часу, калі ў двор заехаў аўтобус-катафалк, якому наканавана было адвезці труну з нябожчыцай і людзей, што тут сабраліся, за горад, на могілкі.

Прайшло некалькі хвілін, і дзверы пад'езда з ляскам адчыніліся. Энергічная жанчына, тая, у чорным, што толькі што спакойна сядзела ля труны, гучна залямантавала:

— Дзе тыя грузчыкі, час труну выносіць, а яны лясы точаць! За што я ім толькі грошы плачу? Чаго стаіце?

Яна накіравала свой пранізлівы позірк у наш бок. Мясцовыя інтэлігенты толькі пакрыўджана паціскалі плячыма: маўляў, мы не тыя, за каго вы нас прынялі. Неўзабаве знайшліся тыя, каго шукалі, і дамавіну ўрэшце вынеслі з кватэры і паставілі ў аўтобус.

— Заходзьце, хто хоча на могілкі ехаць! — уладна загадала жанчына ў чорным. — Час ужо!

У аўтобус зайшло некалькі бабулек з ліку суседзяў Алены Уладзіміраўны. Я сеў у машыну і прыстроіўся за аўтобусам. За мною стаў яшчэ адзін аўтамабіль з нумарам не нашага рэгіёна. Калона з трох машын рушыла ў дарогу.

Святар — а гэта ён ехаў у апошнім аўто — пачаў адпяванне. Я мог бы і не звярнуць на гэта ніякай увагі, але пачуў ціхі голас бабулькі, што стаяла побач:

— Бач ты, не па-нашаму адпявае, нейкага чужога запрасілі.

— Можа, танней бярэ, вось і запрасілі аднекуль, — шэптам патлумачыла іншая.

— А гэтая, бач ты, разкамандавалася, нейкіх інтэлігентных хлопцаў грузчыкамі назвала, пакрыўдзіліся, відаць, нават на могілкі не паехалі, ніхто слова ніякага не скажа, а яна так хацела, каб гаварылі. Мне ўсё Аленка расказвала, планавала ўсё, гаротная, каб не горш чым у людзей.

— А можа, гэты мужчынка нешта скажа, я яго бачыла колькі разоў у Алены, і з жонкай быў, і з дзеткамі...

— Цішэй вы, бач, поп ужо на вас косіцца, перашкаджаеце яму, — азвалася трэцяя з бабулек.

Яе паслухалі, прыціхлі. А святар, тым часам скончыўшы сваю справу, загадаў развітвацца з целам. Развітанне было нядоўгім. Дамавіну зачынілі назаўсёды, і працаўнікі могілак спрытна завяршылі справу.

Усё скончана.

Я еду дамоў, выканаўшы слова, што даў Алене Уладзіміраўне.

***

Кіроўца агромністай машыны імчаў па шашы. Сёння ён узяў у рэйс сына-падлетка, які даўно марыў паехаць з татам і ледзьве дачакаўся надыходу летніх вакацый. Машына плаўна рухалася па гарачым асфальце, быццам не адчуваючы за спінай дзвюх дзясяткаў тон паклажы.

— Тата, а калі мы спынімся? Абед хутка, ты казаў, што пакажаш мне, як кіроўцы карыстаюцца газам пры разагрэве ежы.

— Спынімся, сынку, яшчэ кіламетраў з трыццаць. Праедзем Ленін мост, а там адмысловая пляцоўка ёсць.

— Які мост? Ленін?

— Ленін. Так мост называецца. Дзяўчыну так звалі, што той мост будавала...

Прывітанне ад духу Раства…



Андрэй ХАДАНОВІЧ

* * *

*Кажуць, прадказанні — рэч няўдзячная,
пагатоў у вечар на Каляды…
Дармаедам ежа будзе смачная,
невукі пашыраць далягляды.*

*Шмат шчаслівых зробяцца багатымі,
шмат багатых зробяцца шчаслівымі.
Вадалівам — сябраваць з Блізнятамі,
Рыбам — не сварыцца з Вадалівамі.*

*Панна — у грамадстве запануе,
скорыць кансерватараў-байцоў.
Ра́ку лепей абмінаць піўную.
Фестываль адбудзецца ў Стральцоў.*

*Ворага свабоднае краіны
будуць мучыць сны пра Беларусь,
а крывіч адкажа, як павінны,
нечаканай рыфмай «ганарусь».*

*Га́дам стане сорамна, што га́ды.
З лібераламі вып'е патрыёт.
На Каляды — здарацца Каляды!
Новы год — настане ў Новы год!*

Менск-Калядны

*Скразняк гуляе пад швэдрам.
Вагоны блішчаць бакамі.
Зямля фліртуе з паветрам
і дражніцца цягнікамі.*

*Святло сядае на вейкі,
залоціць рэйкі ў іх гонцы —
і рэйкі ўпадаюць у рэйкі,
і сонца ўпадае ў сонца.*

*На шкле расцвітаюць рыбы
і кветкі плывуць наўкола,
калі ў вандроўныя шыбы
цалуе Святы Мікола.*

*З узораў, нібы цаглінак,
складаюцца лапы ялінак,
і хочаш руку прыкласці:
«Дай лапу, ёлка, на шчасце!»*

*Ідуць па вагонах пешкі
шчаслівыя калядоўшчыкі,
нібы настаўніку вершыкі
расказваюць каля дошкі.*

*Шыбуюць, гонячы стому,
нібыта чакалі нагоды
вярнуцца здалёк дадому
на святы ці на-
заўсёды.*

*З каханымі і сам-насам,
звычайным і бізнэс-класам,
туды, дзе ў небе гірлянды
над станцыяй Менск-Калядны, —*

*імкнуцца мужна і мудра,
як воі добрае волі…
Настаўнік смяецца ў футра:
галоўнае вучні засвоілі.*

* * *

*Надышло трыццаць першага снежня.
Новы год адзначаем? Канешне.*

*У кватэры — далёка да раю,
дзікі вэрхал і лямант адчайны.
Тата енчыць: «Дэдлайны! Дэдлайны!»
Мама ў крык: «Прыбірай!»
Прыбіраю.*

*— Смецце выкіні!
— Слухаю, бос!*



Малюнак www.humanproject.com

*Потым тата бярэ пыласос.
Уключыў — і ўсяго за хвілінку
заганяе ката на ялінку.*

*У сацсетках — калядныя вершыкі.
У суседзяў — разборкі і спеў.
Усё менш да канца трыццаць першага.
Усё болей, чаго не паспеў.*

*Сеў пісаць — не грузілася пошта.
Бег па хлеб — не ўлічыў галалёду.
Не паспеў! А куды? І навошта?
Адкладзём да наступнага году.*

*А пад вечар збіраюцца ўсе.
Хтосьці кнігу (стол-кнігу) нясе.
Хтосьці ставіць у цэнтр стала
пляшку міра, бутэльку святла.*

*За акном — навагодні салют.
На экране — то цар, то вярблюд.
Мандарынкі. Карыца. Халва.
Прывітанне ад духу Раства…*

*Хтось за вокнамі горла дзярэ.
Хтосьці сані спыніў на дварэ.
Новы ранак прылёг на зямлю.
Спіце, родныя. Я вас люблю.*

Робат

*Вершаскладальнік-робат у музеі
працуе для дарослых і дзяцей.
Ствараe на замову й не барзее
па вершы на хвіліну — і часцей.*

*Не патрабуе прэмій, нават лайкаў,
на злосны здзек адказвае дабром:
замовяць штось на «Х» — напіша хайку,
папросяць штось на «Б» — напіша байку,
націснуць «П» — напіша паліндром.*

*Змайструе віншаванне — Merry Christmas! —
з каляднай зоркай і зямлёй святой…
А што ў цябе, лайдак? Застой і крызіс,
застой і крызіс, крызіс і застой!*

*Жывы паэт гарэлку п'е і паліць,
радок накрэмзаў — плача, як дзіця.
І школьнікам, якім вучыць на памяць,
высакародна не псуе жыцця.*

* * *

*Старая скрыпа́чка ў парку зайграла
Догу.
Пенсіянер-кампазітар гаворыць догу:
«Паслухай, як файна!
А памятаеш часы,
калі вось такія смаркачкі
не ведалі вечнай красы?»
А дог у адказ:
«Хто ведае, чым ёсць краса?
Ты рос на «Сабачым вальсе»,
а гэта папса.
Мне хутка паўгода, я слухаю Баха,
прабач…»
Скрыпа́чка ўлезла ў размову:
«Сам ты смаркач!»*

*І ўсё, што адбудзецца потым,
адвеку вядома.
Героі пасварацца й вернуцца
разам дадому.
Іх дог падзякуе Баху,
што стрэліся гаспадары.
Анёлы зайграюць «Сабачы вальс»
угары.*

Патрыятызм

*Калі сонца ўстае за Кармой,
родны кут апяваю мой.*

*Калі пахне чаромха з Веткі,
да радзімы лячу ў адведкі.*

*А не маючы іншых опцый,
зноў пішу ёй, рыфмуючы ў Стоўбцы.*

*Валацуга, які гадамі
мог бы ў Чэрвені жыць пад Мастамі,*

*разбіваю боты і ногі
аб яе Старыя Дарогі.*

*Кожны з нас пацыфіст найшчыры:
нехта ў Грозным жыве, мы ў Міры.*

*Ды над кожнай яе кутузкай
пад Бярозай плачам Картузскай.*

*Пішам гімны па-старасвецку,
сэрца б'ецца, як птушачка ў Клецку.*

*Верш зашпільваем рыфмай-за́пінкай,
не задушаны ейнай Жабінкай.*

*Хай пакутаваць зранку ад смагі нам,
захапляемся ейным Брагінам.*

*Шанавальнікі родных смакаў,
выпіваем пад Пціч і Ракаў.*

*Пад тапонім кожны гамонім,
яна ставіцца з Панямоннем.*

*Скажаш слова любай краіне,
а яна — прамову Задзвінне,*

*аж гудзе на гарышчы і ў склепе:
слова — Добруш, маўчанне — Лепель.*

* * *

*…Бо 25 сакавіка
зрынулі Саўрана з трона.
Час пасмяецца з дручка дурачка
й назгулаў эскадрона.*

*Можаш музыкаў у аўтазак,
можаш фэйсбучных пісакаў.
Кепскія нервы — фірмовы знак
Валадара аўтазакаў.*

*Доўга шліфуецца чарнавік,
ды пасталее аматар.
Новыя песні. Плюс сакавік.
Мінус стары дыктатар.*

*Потым хай здымуць кіно — і хай
зробіць добрую касу
фільм, дзе абуджаны сонны край
зрушыў бы стрэлкі часу.*

*Іх затрымаць — не хопіць палка,
войска не хопіць ніколі.
Бо 25 сакавіка
зрынулі з трона…
З Днём Волі!*

25 сакавіка 2019

самалёт

*зямля памяншалася й неба расло
анёл гравітацыі лёг на крыло*

*дыспетчарка ноч адпусціла эскорт
і лішнія страхі баластам за борт*

*бяссонніца ў форме прынесла напой
і ўсе каго крыўдзіў сядаюць з табой*

*у кожным кілішку пацыфік віны
і слухае тосты дэтэктар маны*

*пакуль паясы вяжуць час па руках
і дзіўныя песні трымаю ў зубах*

*на спінцы фатэля кіно пра жыццё
пытае лацінай «куды леціцё?»*

*а потым курносая ў стылі хэнтай
гуляючы з коскай «пакуль палятай*

*мы вольныя птушкі і кратаў няма
ты сам сабе вязень прысуд і турма*

*спявай да каляднае зоркі ўваччу
а коскі расставіць пасля прылячу*

*глядзі як зіхцяць у касмічным віры
ўсе-яблыкі-ўсе-залатыя-шары*

*як ззяе прапелер каронай святла
глядзі, над зямлёй зорка сонца ўзышла»*

Ліст

*Сяду за стол цвярозым,
стану пісаць лісты:
Санта з Дзедам-Марозам,
Зюзя й Мікола Святы!
Хай ні дачку, ні жонку
цуд ваш не абміне —
прыйдзе знутры і звонку,
і крыху — ад мяне.*

*Дайце пісьменніку свята
з кніжкаю і казой,
цыніку — вершы без мату
з радасцю і слязой.
Тэлевізару — сорам,
хай гэту ноч адпачне.
Неба — калядным зорам.
…І чагось для мяне.*

*Хай усміхнецца ўдача
ворагам і сябрам,
кожны — смяецца й плача,
храмаў хапае і крам.
Хлопца — кожнай дзяўчыне,
а не захоча — дык не,
незалежнасць — краіне.
…І чагось для мяне.*

*Зюзя з Дзедам-Марозам,
Санта з Міколам Святым!
Трохі сэрца і розуму
дайце гэтым і тым.
Хай ні далёкіх, ні блізкіх
больш не заб'юць на вайне.
…Ёлку ў святочных бліскіх.
…І чагось для мяне.*



Уладзімір АРЛОЎ

Гарады і мястэчкі нашых прадзедаў

Нашы гарады ў першай палове XIX стагоддзя моцна адрозніваліся ад сённяшніх. Яны не мелі шматпавярховых дамоў. Найвышэйшымі будынкамі былі цэрквы ды касцёлы і — дзе-нідзе — ратушы, якім пашанцавала не быць зруйнаванымі на загад расейскіх уладаў. Мураваныя пабудовы стаялі ў цэнтры, а навокал разлягаліся вуліцы і завулкі з прысадзістымі драўлянымі сядзібамі. Брукам маглі парадаваць адны цэнтральныя вуліцы. Самым хуткім транспартам былі карэты і фурманкі. У краі налічвалася 42 гарады, дзе жыло 300 тысяч чалавек. Найбуйнейшыя гарады таго часу — Вільня, Магілёў, Менск, Віцебск, Горадня, Берасце, Бабруйск, Пінск, Полацак, Слонім. Больш за 200 тысяч жыхароў мелі сярэднія паміж горадам і вёскай паселішчы — мястэчкі. Разам з беларускай моваю на гарадскіх і мястэчковых вуліцах і пляцах часта гучалі габрэйская, польская і расейская.

Вільня

Былую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага царскія ўлады зрабілі цэнтрам губерні. Вільня з насельніцтвам 50 тысяч жыхароў была самым буйным горадам краю. Горад меў дзесяць прадмесцяў з даўнімі беларускімі назвамі: Антокаль, Папоўшчына, Зарэчча, Паплавы, Росы, Востры Канец, Руднішкі, Пагулянка, Лукішкі і Сніпішкі. У Вільні стаялі блізу тысячы мураваных будынкаў, дзясяткі касцёлаў, цэркваў і манастыроў, некалькі сінагогаў, шмат палацаў арыстакратыі. Колішняя ратуша не павінна была нагадваць віленцам пра скасаваныя гарадскія вольнасці — і была прыстасаваная пад тэатр.

Пасля паўстання 1831 года каланізатары зачынілі Віленскі ўніверсітэт. Цяпер Вільня не была студэнцкім горадам, але там жылі вучоныя і творцы, дзейнічалі друкарні, выходзілі кнігі і газеты.

Па віленскіх вуліцах хадзілі літаратар і краязнаўца Уладзіслаў Сыракомля і аўтар шматлікіх гістарычных раманаў і аповесцяў Язэп Крашэўскі. Тут працавалі гісторыкі Тодар Нарбут і Адам Кіркор. Кожны віленец ведаў кампазітара Станіслава Манюшку, які шмат гадоў быў арганістам у Святаянаўскім касцёле.

Былы сябра таварыстваў філаматаў і філарэтаў, паэт і фалькларыст Ян Чачот выдаваў у Вільні свае вершы і балады, сабраныя ім беларускія народныя песні. Яшчэ адзін удзельнік патрыятычнага студэнцкага руху, аўтар «Песні філарэтаў» Антон Адынец, рэдагаваў газету «Віленскі веснік».

Шырокі розгалас мела адкрыццё ў 1856 годзе Віленскага музея старажытнасцяў. Заснавальнікам музея, што размясціўся ў залах бібліятэкі зачыненага каланізатарамі Віленскага ўніверсітэта, стаў гісторык і археолаг граф Яўстах Тышкевіч. Ягоным паплечнікам быў родны брат Канстанцін, які таксама паспяхова займаўся гістарычнымі росшукамі. У музеі налічвалася болей за дзесяць тысяч экспанатаў. Пры музеі браты Тышкевічы стварылі навукова-асветную ўстанову — Віленскую археалагічную камісію. Яна расшуквала і друкавала старажытныя дакументы і летапісы, ладзіла археалагічныя і этнаграфічныя экспедыцыі. Вывучэнне гісторыі Беларусі, яе народных традыцый і мовы набліжала нацыянальнае адраджэнне беларусаў.

Вільня заставалася культурнай сталіцаю краю.

Губернскі Менск

У цяперашняй беларускай сталіцы, а на той час губернскім горадзе Менску ў сярэдзіне папамінулага стагоддзя было 25 тысяч жыхароў.

«Сэрцам» Менска, як і даўней, заставаўся Высокі рынак, або Высокае места. Так называлася размешчаная на ўзгорку цэнтральная частка горада. Тут уздымалі ў неба вежы і званіцы галоўныя менскія храмы: езуіцкі касцёл Дзевы Марыі, вуніяцкая царква Святога Духу, касцёл Звеставання пры кляштары манашак-бернардынак, касцёл святога Язэпа пры кляштары бернардынцаў. Усе гэтыя бажніцы захаваліся або былі адноўленыя і цяпер зноў радуюць вока менчукоў. Высокае места аздабляла і ратуша з палацамі Сапегаў і Радзівілаў. Побач стаялі дзясяткі крамаў з разнастайнымі таварамі.

Да шырокага і забрукаванага, бачнага здалёк Высокага рынку (цяпер плошча Свабоды) сыходзіліся ўсе галоўныя вуліцы: Койданаўская (цяпер Рэвалюцыйная), Феліцыянаўская (цяпер Камсамольская), Францішканская (Леніна) і Дамініканская (Энгельса), што вяла на Гандлёвы рынак у Новым месцы. Гэтыя вуліцы мелі шмат крамаў, што суседзілі з жылымі будынкамі. Мала чым саступалі галоўным вуліцам блізкія да іх Захараўская (пачатак цяперашняга праспекта Незалежнасці), Валоцкая (частка Інтэрнацыянальнай) і Юраўская (не захавалася).

Усяго ў Менску ў той час было 46 вуліц, з іх 22 — брукаваныя. На іх налічвалася прыблізна паўтары тысячы будынкаў, з якіх мураваных — менш за палову. З муранкамі суседзілі адна- а часам двухпавярховыя драўляныя дамы на цагляных падмурках.



Менск, Высокі Рынак

На вуліцы Францішканскай стаяў прыгожы каменны двухпавярховы будынак гімназіі, дзе ў тыя часы вучылася шмат знакамітых у будучым людзей: паэт Тамаш Зан, кампазітар Станіслаў Манюшка, географ і заолаг Бенядзікт Дыбоўскі, біёлаг Канстанцін Ельскі, гісторык Тадэвуш Корзан, астраном Міхал Глушневіч, правазнаўца і літаратар Уладзімір Спасовіч.

Менчукі паважалі беларускага пісьменніка і драматурга Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. У 1852 годзе створанае ім тэатральнае згуртаванне паставіла ў Менску оперу «Сялянка». П'есу для яе напісаў сам Марцінкевіч, музыку — Станіслаў Манюшка. Са сцэны ў «Сялянцы» гучала беларуская мова, таму менавіта з гэтай пастаноўкі адлічваецца гісторыя айчыннага тэатральнага мастацтва новага часу.

У Менску пасля сібірскай высылкі за падтрымку Напалеона жыў славуты мастак Ян Дамель. Менчукі з гонарам казалі пра бліскучага партрэтыста Валянціна Ваньковіча. Дом роду Ваньковічаў захаваўся дасёння. Цяпер там створаны музей, што дае ўяўленне пра шляхецкі побыт, культуру і мастацва першай паловы XIX стагоддзя.

Чаго не змог сказаць Сыракомля

Наведваючы ў 1850-я гады Менск, пісьменнік і краязнаўца Уладзіслаў Сыракомля пісаў: «Вид города визначаецца акуратнасцю і парадкам. Шырока раскінуты абапал ракі Свіслачы, ён уражвае хараством краявідаў. Вуліцы шырокія і прамыя, дамы не заціснутыя, паветра чыстае, скрозь даступнае павевам ветру.Туркочуць і размінаюцца аднаконныя дрожкі (карэты), вірує люд, пры гэтым на вуліцах няма тлуму, бо ўсім тут прасторна. Будынкі важнага значэння не засланяюцца суседнімі і выступаюць ва ўсёй велічы. Апроч вялікіх Губернатарскага парку і Архірэйскага саду Менск налічвае васямнаццаць прыватных садоў і 239 агародаў».

Але не ўсё ў Менску было так прыгожа і прытульна. Сыракомля друкаваў свае нататкі, калі пільная царская цэнзура сачыла за выданнем кніг, газет і часопісаў, выкідаючы адтуль усё «падазронае» і «шкоднае». Пісьменнік не мог паведаміць чытачу, што першым новым вялікім збудаваннем у Менску, калі беларускія землі акупавала Расея, стаў Турэмны замак. У гэтай велізарнай вязніцы адбывалі пакаранне змагары 1831 года, а пазней — удзельнікі паўстання Каліноўскага. За сувязь з каліноўцамі там быў зняволены і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Дарэчы, ягоны спектакль «Сялянка» адразу пасля першага паказу быў забаронены і надалей ставіўся нелегальна.

Не мог Сыракомля адкрыта напісаць і пра лёс Менскай ратушы. На пастанове пра яе руйнаванне стаіць уласнаручны подпіс цара Мікалая I. Ратушу знеслі, бо «она своим видом напоминала жителям о Магдебургском праве, об обычаях минувшего времени».

Новыя ўлады імкнуліся сцерці памяць пра былую беларускую незалежнасць, але самі ж царскія чыноўнікі пісалі, што і праз пяцьдзясят гадоў іхняга панавання расейская культура ў Менску і наогул ва ўсіх беларускіх гарадах, мястэчках і вёсках заставалася чужой і незразумелай.

Павятовы Полацак

Сталіцу нашай першай дзяржавы — Полацкага княства, а затым — у Вялікім Княстве Літоўскім — сталіцу Полацкага ваяводства каланізатары ператварылі ў павятовы горад. Праўда, пра яго былую веліч нагадвалі шматлікія храмы і манастыры. Адзін з замежных падарожнікаў, мастак паводле прафесіі, параўнаў той Полацак з італьянскімі гарадамі і адзначыў, што тут забываеш, што ты не ў сталіцы.

На Дзвіне ад раніцы да вечара мільгацелі лодкі з ветразямі і вёсламі. Штодня ўніз па рацэ ўбок Рыгі праходзілі дзясяткі даўжэзных плытоў. Людзі на вуліцах — беларускія сяляне і шляхцічы, імперскае чыначенства і габрэйскія гандляры ды рамеснікі — былі ў розных уборах, прычым кожны гаварыў на сваёй мове.

Саборы святой Сафіі і святога Стэфана так уразілі заезджага мастака лёгкасцю і вытанчанасцю архітэктуры, што ён быў гатовы паверыць нечым словам, нібыта гэтыя храмы пабудаваныя па малюнках італьянца Мікеланджэла.

Між тым гэта быў толькі вонкавы выгляд горада, у якім ужо некалькі дзесяцігоддзяў гаспадарылі чужынцы. Пасля змагарнага 1831 года ўлады зачынілі вуніяцкія манастыры базылянак і базылянаў. Замкі і пячаткі з двухгаловым арлом з'явіліся і на дзвярах вуніяцкай духоўнай семінарыі: у 1839-м Вуніяцкая царква на беларускіх землях была знішчаная. Галоўную святыню беларускіх вуніятаў — Сафійскі сабор — перадалі праваслаўным.

Яшчэ раней былі зачыненыя Полацкая акадэмія, ліцэй манахаў-піяраў, навучальні пры бернардзінскім і францішканскім кляштарах. На змену ім прыходзілі расейскія школы, што павінны былі выхоўваць «русских людей» і паслухмяных падданых. Асвета ў Беларусі панізілася да страшэнна нізкага роўню. Улада кіравалася думкай, што школа з навучаннем па-расейску зробіць на паняволеных землях нашмат болей за армію.

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў горадзе над Дзвіной налічвалася 15 тысяч жыхароў. Цэнтральныя вуліцы былі забрукаваныя, увечары на іх загараліся ліхтары, але прадмесці ўвесну і ўвосень патаналі ў брудзе.

Простыя месцічы па-ранейшаму трымалі ў хлеўчуках свойскую жывёлу. На прыгарадных лугавінах пасвіліся каровы, козы і авечкі. Перад Калядамі на полацкіх падворках смалілі вепрукоў.

На гародах побач з капустай, цыбуляй, гуркамі, бурачкамі, часнаком і кропам усё часцей ганаровае месца займала невядомая яшчэ сто гадоў таму бульба. Пра багацце садоў сведчыць тое, што ва ўраджайныя гады яблыкі, грушы і вішні прадавалі цэлымі вазамі.

Нямала палачанаў, як і некалькі стагоддзяў таму, займаліся паляваннем і рыбалкай. Зверыны ў навакольных лясах вялося столькі, што на продаж адпраўлялі штогод дзясяткі пудоў ласіных шкураў і рагоў. Калі чытаеш пра здабычу полацкіх рыбакоў, здаецца, што ў руках у цябе кніга казак. Сярэдні дзвінскі сом, напрыклад, важыў тры пуды, гэта значыць пад 50 кілаграмаў. Такая рыбіна магла цэлыя вёрсты вазіць рыбака з лодкай уніз і ўверх па рацэ.

Калі б мы зазірнулі ў дамы палачанаў і прыселі з гаспадарамі за стол, то пераканаліся б, што многія традыцыйныя стравы і напоі за стагоддзі мала змяніліся. Разам з тым палачане, як і ўсе беларусы, пачыналі ўсё ахвотней гатаваць стравы з бульбы. З халодных вараных бульбін і брусмічнага сочыва з морквай, грушамі або «райскімі» яблычкамі рабілі смачны дэсерт. Яго ў Прыдзвінні можна пакаштаваць і цяпер.

Працяг на стар. 16 (10) »

« Працяг.
Пачатак на стар. 15 (9)

У Полацку, зразумела, пілі і моцныя напоі, ды самым пашыраным і тут, і па ўсім беларускім абшары быў квас. Найсмачнейшым лічыўся квас чырвонага колеру, зроблены на падсмажаных сухарах. Гэты напой гатавалі і з буракоў, бярозавіку, яблыкаў і грушаў. Былі квасы з каліны, брусніцаў, журавінаў, арабіны. Заможныя гаспадары мелі на стале сапраўдныя гарбату і каву, хоць усе месцічы, як і даўней, любілі заварваць ліпавую кветцень, святаяннік, чабор. На дадатак са склепу маглі прынесці кухаль моцнае медавухі.

Прыблізна так ішло жыццё і ў іншых павятовых гарадах.

Паміж горадам і вёскай

Літва-Беларусь мела блізу 300 мястэчак. Гэтыя паселішчы здаўна розніліся з гарадамі меншым насельніцтвам, адсутнасцю абарончых збудаванняў і тым, то местачкоўцы больш займаліся сельскай гаспадаркай. Але, адрозна ад вёскі, важнымі заняткамі местачкоўцаў былі рамёствы і гандаль.

На местачковай плошчы стаялі царква ці касцёл, а часта абодва храмы разам. Недалёка ад іх звычайна ўзвышалася сінагога, а часам і мячэць, бо ўжо некалькі стагоддзяў на нашых землях мірна жылі татары.

Буйнымі мястэчкамі лічыліся Зэльва, Лынтупы, Відзы, Смалявічы, Іўе, Баруны, Бяроза Картузская, Лёзна, Бялынічы, Смаргонь, Крэва, Шчучын, Глыбокае, Мядзел, Друя, Косава, Каменец, Любча, Давыд-Гарадок. Многія з іх ганарыліся даўняй гісторыяй і пазней ператварыліся ў гарады.

Нямала мястэчак сталіся значнымі асяродкамі культуры і асветы. У Лагойску графы Канстанцін і Яўстах Тышкевічы стварылі першы на беларускіх землях музей старажытнасцяў. Ягоныя наведнікі маглі пазнаёміцца са зборам даўніх рукапісаў, калекцыяй карцін і багатай бібліятэкай. Іншы беларускі арыстакрат Канстанцін Тызенгаўз сабраў велізарную калекцыю з трох тысяч відаў птушак з усяго свету і адчыніў арніталагічны музей у Паставах.

У Шклове існаваў вялікі тэатр, дзе гралі прыгонныя акторы. Таленавітыя падлеткі займаліся ў створаных пры тэатры балетнай і музычнай школах. Лепшых шклоўскіх артыстаў забралі ў пецярбургскія тэатры.

З 1840 года ў мястэчку Горкі, якое стала павятовым цэнтрам, дзейнічала земляробчая школа, неўзабаве пераўтвораная ў вышэйшую навучальную ўстанову — Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Гімназія мястэчка Свіслач на Гарадзеншчыне дала адукацыю цэламу сузор'ю знаных асобаў: будучым кіраўнікам вызвольнага паўстання 1863 года Кастусю Каліноўскаму і Рамуальду Траўгуту, мастакам Напалеону Орду і Януару Сухадольскаму, пісьменнікам Язэпу Крашэўскаму і Лявону Патоцкаму, філолагу і гісторыку Восіпу Кавалеўскаму. Юдэйскія навучальныя ўстановы для габрэйскай моладзі — ешывы — існавалі ў Валожыне, Міры, Іўі, Ружанах.

Царскія законы забаранілі габрэям-юдэям сяліцца па-за былымі межамі Вялікага Княства Літоўскага. Гэта прывяло да таго, што ў сярэдзіне XIX стагоддзя габрэі складалі большасць местачковага жыхарства.



Старадаўні кірмаш


Сучасны выгляд колішняй шляхецкай сядзібы ў Падароску. Фота Sputnik

Старадаўні Падароск

Адно з беларускіх мястэчак з даўняй і цікавай гісторыяй — маляўнічы Падароск на рацэ Зяльвянцы непадалёк ад Ваўкавыска. Упершыню Падароск згаданы ў гістарычных дакументах пад 1522 годам. Ужо тады там стаяў касцёл, а пазней збудавалі і вуніяцкую царкву.

Як і многія мястэчкі Вялікага Княства, Падароск меў магдэбургскае права на самакіраванне, атрыманае ад вялікага князя і караля Яна Казіміра Вазы ў 1660 годзе. У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай мястэчка апынулася пад царскай уладай і было гэтага права пазбаўленае.

Падароскам у розны час валодалі ліцьвінскія шляхецкія роды Клочкаў, Дольскіх, Грыбоўскіх. У XIX стагоддзі там гаспадарылі Чачоты, чый род даў паэта Яна Чачота. Затым маёнтак Падароск набыў Раман Бохвіц — сын філосафа Фларыяна Бохвіца. Пры новым гаспадары сядзібны дом набыў цяперашні выгляд: лёгкі і зграбны двухпавярховы будынак з калонамі, тэрасай і мансардай. Вакол дома, што глядзеўся ў азярыну, разлягаўся вялікі парк са старасвецкімі клёнамі, ліпамі, акацыямі.

У Падароску дзейнічалі бровар, вадзяны млын, сукнавальня. Прыбыткова ішоў гандаль на мясцовых кірмашах.

На пачатку XXI стагоддзя былы маёнтак Бохвіцаў стаяў у занядбанні, палохаючы выбітымі вокнамі ды бруднымі абшарпанымі сценамі. Колішні прыгожы дом і парк маглі проста знікнуць, але ім пашанцавала. Падароскую сядзібу набыў беларускі бізнесовец і мецэнат Павел Бераговіч. У адрэстаўраваным будынку адчыніліся музей гісторыі беларускай шляхты. Побач з'явіцца заезны дом, карчма, алея славы з бюстамі-помнікамі. Маёнтак Падароск сёння робіцца прывабным для турыстаў, а значыць, новае жыццё пачынаецца і ў даўнім мястэчку.

Тагачасныя прадпрыемствы

Бальшыня гараджанаў у тыя часы па-ранейшаму займалася рамяством і гандлем. Гісторыкі падлічылі, што ў гарадах працавалі больш за 20 тысяч рамеснікаў блізу ста спецыяльнасцяў.

У Полацку ў сярэдзіне XIX стагоддзя, да прыкладу, было 155 шаўцоў, 97 краўцоў, 25 хлебапёкаў, 22 цесляры, 20 муляраў, 16 разнікоў (мяснікоў), 11 сталяроў, 6 кавалёў. Параўнаўча з мінулым зніклі шабельнікі, пішчальнікі, наогул усе збройнікі, затое з'явіліся гадзіннікавыя майстры і фартэпіяннікі. Побач з рамесніцкімі майстэрнямі ўтварыліся буйнейшыя прадпрыемствы: сем гарбарняў, тры піваварні і тры вапнярні, тытунёвы і свечкавы заводзікі, цагельня, медаварня і бровар.

Менск меў дванаццаць тытунёвых заводзікаў, шэсць свечкавых, гарбарныя, палатняныя і салатопныя прадпрыемствы. У Горадні, якая таксама была цэнтрам губерні, дымілі коміны сарака невялікіх фабрык: цагельных, свечкавых, фланэлевых. Карысталася попытам прадукцыя мясцовых піваварняў. Мукамольныя фабрыкі дзейнічалі ў Віцебску, Магілёве і Пінску. Некалькі сотняў працаўнікоў былі занятыя на гомельскіх цукровай, шкляной, крупадзёрнай, некалькіх канатна-вяровачных і лесапільных фабрыках. Але такія прадпрыемствы, што існавалі ў гарадах і ў мястэчках, нельга параўноўваць з сучаснымі. У царскай імперыі фабрыкай ужо лічылася прадпрыемства, дзе налічвалася не меней за сямнаццаць рабочых.

На большасці тагачасных фабрык праца была ручная, але з'явіліся і прадпрыемствы з паравымі рухавікамі. Першыя такія фабрыкі, што выраблялі сукно, адчыніліся ў 1820-х гадах у мястэчках Хомск і Косава Гарадзенскай губерні. Туды хадзілі на працу па некалькі сотняў рабочых з ліку прыгонных сялянаў.

Аднак прыгоннае права рабілася велізарнай перашкодаю для развіцця прамысловасці.

Няма ў краме — купіш на кірмашы

У гарадах і мястэчках ішоў разнастайны гандаль.

Палачане маглі набываць тавары ў 339 крамах, хоць палова з іх разам з гаспадарамі вандравалі па вуліцах і ўяўлялі сабой звычайныя лёгкія шапікі. З іх прадавалі хлеб, муку, садавіну, цвікі, свечкі, мыла. У губернскім Менску, калі яго наведаў Сыракомля, крамаў толькі пры дамах было 423, у тым ліку — вялікія гандлёвыя камяніцы купцоў Гольдберга і Аксельрода, склады тавараў Гурвіна і Рапапорта.

Вельмі важнае месца ў жыцці гарадоў і мястэчак займалі кірмашы. Звычайна іх прымяркоўвалі да рэлігійных святаў, таму кірмашы часта так і называліся — Траецкі, Спасаўскі, Пакроўскі. На шматгалосых і шматмоўных кірмашах можна было набыць любы тавар — ад цвікоў і чаравікаў да шыкоўных карэт і паравых рухавікоў. Апрача мясцовых тавараў тут гандлявалі і прывезенымі здалёк. З Прыбалтыкі везлі фарбы, адзенне, «заморскія» гарбату і каву. Польскія купцы прапаноўвалі дываны, люстэркі, разнастайныя інструменты. Цаніўся парцалянавы і фаянсавы посуд з Смаленскай губерні, скураныя тавары з Казані, жалезныя і медныя вырабы тульскіх заводаў.

На некаторых кірмашах гандлявалі пераважна нейкім адным таварам. Мазыр славіўся продажам свойскай жывёлы. У Мсціслаў з блізкага і далёкага наваколля звозілі пяньку і скуры, у Слонім — збожжа і драўніну, у Пінск — шчаціну, воск, мёд, масла і алей. Восеньскі кірмаш у мястэчку Парычы Менскай губерні славіўся на ўсю Беларусь гандлем грыбамі.

У беларускіх губернях штогод адбывалася прыблізна 200 кірмашоў, прычым дваццаць з іх былі буйнымі. Менскі кірмаш віраваў ад 25 траўня да 25 чэрвеня. У сярэдзіне XIX стагоддзя тры штогадовыя гомельскія кірмашы прадавалі тавараў на велізарныя па тых часах грошы — болей чым на мільён рублёў.

Аднымі з найбагацейшых былі Ганненскія (у гонар святой Ганны) кірмашы ў мястэчку Зэльва на Гарадзеншчыне. Некаторыя гісторыкі гандлю лічаць, што ва ўсёй Еўропе гэтыя кірмашы, якія доўжыліся амаль месяц, саступалі толькі ляйпцыгскім у Нямеччыне. У Зэльве тавараў сыходзіла пакупнікам на два з лішнім мільёны рублёў.

Завітаўшы ў тыя дні ў Зэльву, вы даліся б дзіву ад шматлюдпасці і маляўнічасці таго, што дзеецца навокал. Вось паважна гандлююць соллю, селядцамі, кавай і тканінамі купцы з Прусіі ды латышы з Рыгі. Побач украінцы і смуглявыя прадаўцы з балканскіх краёў жвава і з вясёлымі жартамі прапануюць набыць у іх збожжа, тытунь, цукар, віно. Тут сустрэнеш гандлёвых людзей з літоўскай Коўні, з Пецярбурга і Ніжняга Ноўгарада. Шмат пакупнікоў каля гандлёвых радоў, дзе прадаюць якаснае сукно з беларускіх фабрык у Альбярціне, Слоніме, Ваўкавыску і Косаве. Асабліва важны тавар — коні. Іх у Зэльве за адзін кірмаш маглі прадаць некалькі тысяч...

Зямныя і водныя шляхі

Росту гандлю спрыялі новыя зямныя і водныя шляхі, а найперш — з'яўленне паравога транспарту.

Праз Беларусь праклалі грунтовыя шасэйныя дарогі, якія злучылі Пецярбург з Кіевам, а Маскву з Рыгай. Магілёўскую, Менскую і Гарадзенскую губерні перасекла Маскоўска-Варшаўская шаша. Але добрых наземных шляхоў было няшмат. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў нашым краі іх агульная працягласць не перавышала 1500 кіламетраў.

Як і даўней, важнымі шляхамі заставаліся суднаходныя рэкі-працаўніцы: Дняпро, Дзвіна, Нёман, Бярэзіна, Прыпяць. З Літвы-Беларусі праз іх патраплялі ў чарнаморскія і балтыйскія порты. Бярэзінскі, Агінскі і Дняпроўска-Бугскі каналы звязалі Дняпро з Дзвіной, Нёманам і Віслай. На рэках і каналах стаяла блізу сотні прыстаняў. Да іх прычальвалі драўляныя караблі розных памераў і грузападымальнасці: барлíны, бáркі, байдакí. Яны хадзілі пад ветразямі, на вёслах, а часам з дапамогаю конскай сілы або людзей, якія цягнулі карабель на канатах, ідучы па беразе. Самыя вялікія з такіх караблёў маглі мець даўжыню 65 метраў, шырыню 15 метраў і перавозіць тысячу тон грузу.

Калі б вы перанесліся ў тыя часы і паставілі намёт на беразе вялікай беларускай ракі, то абавязкова ўбачылі б доўгія плыты і пачулі песні асначоў-плытнікаў. Тры галоўныя шляхі сплаву драўніны пачыналіся ў Пінску. Па Піне і Прыпяці, а затым па Дняпры караваны з бярвёнаў ішлі на Украіну і Крым. З Прыпяці праз Агінскі канал аснычы траплялі ў Нёман і гналі плыты ў нямецкі Кёнігсберг (Каралевец). Праз Дняпроўска-Бугскі канал, Заходні Буг і Мухавец плыты выходзілі ў Віслу ды ішлі да партовага Данцыга (Гданьска). Драўніна была адным з галоўных тавараў тагачаснай беларускай гаспадаркі.

Параплавы на нашых рэках, перадусім на Дняпры, з'явіліся ў 1820-х гадах, аднак іх было мала. Ад Пінскай прыстані ў 1850-м адышоў да ўкраінскага Крэменчуга першы пасажырскі паравы карабель «Вісла». Па Нёмане параплаў зрабіў першы рэйс у 1854 годзе. Рэгулярны рух грузавых і пасажырскіх параплаваў быў наладжаны ўжо ў другой палове XIX стагоддзя. У 1858-м утварылася «Таварыства параходства па Дняпры і яго прытоках», што мела вялікі пасажырскі і грузавы флот. Частку параплаваў назвалі ў гонар беларускіх гарадоў і рэк — «Жлобін», «Ветка», «Сож»...

Чыгуначны рух распачаўся таксама ў другой палове стагоддзя. З 1861 года Дзвінск быў звязаны цягнікамі з Рыгай. Праз год пайшлі першыя лакаматывы Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Апрача Дзвінска беларускія губерні мелі буйныя станцыі Вільня, Горадня, Парэчча, Беласток. У 1860-х гадах да іх далучыліся Бігосава, Полацак і Віцебск, а з 1871-га нашыя прадзеды ўжо маглі падарожнічаць па жалезнай магістралі Смаленск—Менск—Берасце...

Паэзія зніклых: Батыр Бердыеў

Развал Савецкага Саюза ў 1991 годзе прынёс вызваленне запрыгоненым народам. І мы вохнулі, калі ўбачылі, на якіх розных палюсах грамадскага развіцця знаходзяцца нашыя народы. У Прыбалтыйскіх краінах незалежнасць спалучылася з усталяваннем еўрапейскай дэмакратыі, па цярністым шляху да дэмакратычнага ладу ідуць Украіна, Грузія, Малдова, на хвалях аўтарытарызму гушкаюцца Расія, Беларусь, Азербайджан. А ў далёкім Узбекістане і Туркменіі ўсталяваліся пачварныя сярэднявечныя дыктатуры. А ўсё ж гэта калісь выдавалася за «адзіны савецкі народ»...

Батыр Бердыеў, філолаг і жуналіст з Туркменістана, апынуўся ў гушчы тагачасных падзей. Ён нарадзіўся 3 кастрычніка 1960 года. Працаваў журналістам яшчэ ў маладзевых савецкіх выданнях, затым у міністэрстве замежных спраў Туркменістана. У 1995 годзе быў паслом у Аўстрыі, Славакіі і Чэхіі ды аднachасова прадстаўніком Туркменістана пры АБСЕ. У 2000 годзе прызначаны міністрам замежных спраў Туркменістана. Праз год быў звольнены за «недахопы ў працы» і знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

Быў арыштаваны ў снежні 2002 года і абвінавачаны ў замаху на жыццё былога прэзідэнта Сапармурата Ніязава. Быў катаваны, асуджаны закрытым судом на 25 гадоў зняволення. У турме пісаў вершы па-руску. Творы, напісаныя ў першыя месяцы зняволення (снежань 2002 — сакавік 2003 года), Батыру Бердыеву яшчэ ўдалося нейкім цудам перадаць на волю. Затым яны былі таемна перапраўлены з Туркменістана за мяжу і пры дапамозе міжнароднай праваабарончай кампаніі «Пакажыце іх жывымі!» выдадзеныя зборнікам «Песня развітання» («Песня прощания»). Апошнія звесткі пра Батыра Бердыева дайшлі ў 2005 годзе. Пасля гэтага ягоны лёс невядомы.

Батыр Бердыеў не адзіны зняволены ў Туркменістане, пра якіх грамадства нічога не ведае. Гвалтоўныя знікненні зняволеных там — распаўсюджаная практыка. Такі ж лёс напаткаў папярэдняга перад Батырам Бердыевым міністра замежных спраў Туркменістана Барыса Шыхмурадава.

Руская мова не была для Батыра Бердыева роднай, і гэта адчуваецца ў ягоных вершах. Беларуская паэтка Галіна Дубянецкая фактычна перастварыла іх. Але ў вершах Батыра Бердыева ёсць іншая якасць: найвышэйшая шчырасць радкоў, напісаных у турэмных лёхах. Ягоныя вершы — гэта шчымлівае развітанне з жонкаю, з сынам, з жыццём. Ён выдатна ведаў, што яго чакае, і спрабаваў занатаваць самае галоўнае і каштоўнае, што было ў ягоным жыцці. Успаміны — гэта тое, што нельга адняць і ў самага няшчаснага зняволенага:


Помніш, як па мастку мы прайшлі
і выйшлі на прыстань,
Зрэшты, прыстані там — гэта цалкам
будзённа і звыкла,
І на плошчы Сан-Марка, — а як жа, —
зрабілі мы здымак,
Дзе ў званочках малы наш дурэе,
і ў сонца разлівах...

Турэмныя вершы Батыра Бердыева хваляміі шчырасці перагукаюцца з турэмнай лірыкай былога беларускага палітычнага вязня Уладзіміра Някляева, які пісаў, седзячы ў камеры і не ведаючы, што яго чакае наперадзе:

Праз кра́ты, праз калючыя драты,
Апоўначы ўсміхнулася мне ты...

Вера, надзея, каханне дапамагаюць чалавеку выжываць у турме, а яшчэ энергія людзей, якія памятаюць пра яго, энергія, якую не могуць спыніць ніякія турэмныя сцены.

Алесь Бяляцкі



Фота www.spring96.com

***

Маёй любай,
адзінай Бахарачцы

Калі ноч разнасцежыцца небам
зорным і вольным,
Я скраду цябе ад разлук і страт,
Аднясу на руках цябе ў хвалі
макаў польных,
Дзе да рання ў нас будзе
духмяны спрат.

Пакамечацца строі,
вецер стогнам нап'ецца,
Узварушыць густы
квецця-зёлак настой,
І раптоўная знічка
з нябёсаў сарвецца,
Затрапеча на вейках
шчаснай слязой.

І шаптаць будуць вусны,
з дыханнем няроўным,
Таропкія словы, пяшчоту й боль
згарэлай душы,
І вялікая ўсёдаравальная поўня
Ўкаранує шлюб наш у касмічнай імшы.

Золак росамі нас прахалоднымі ўмые,
Ў першым промні ўспыхне на грудзях
крыжык маленькі твой,
І заружавеецца сарамліва
Сонца, ўражанае тваёй пекнатой.

Пазачассе

Не зіма ані восень — памежжа сезон
безназоўны,
І папляміла іржавае лісце
садовыя сходы.
І чакае душа, як басяк беспрытульны,
бяссонны,
Утварэння раптоўнага цуду, на раз,
без нагоды.

А ў Венецыі, пэўна, адхланне цяпер
ад нашэсця турыстаў,
Не чутно гандальерскага клічу
з каналаў аціхлых...
Помніш, як па мастку мы прайшлі
і выйшлі на прыстань —
Зрэшты, прыстані там — гэта цалкам
будзённа і звыкла.

І на плошчы Сан-Марка, — а як жа, —
зрабілі мы здымак,
Дзе ў званочках малы наш дурэе
і ў сонца разлівах.
Абсалютнага шчасця імгненне
вось так несацяжна
След на фотапаперы пакінула —
Маркусу VIVA!

Натамілі тады нас палацы, масты,
пераходы,
Брукаваныя вулкі, памкнёныя ў век
Адраджэння,
І, застылыя ў мармуры, музыкі
ўзнёслай акорды,
І трагічныя маскі сям-там на шляху,
бы трызненні.

І на пляцы маленькім,
дзе блікі гулялі на плітках,
Дзе над ціхім каналам пятрэе
бялізна заўсёды,
І з царквы старадаўнай даносяцца
гукі малітвы,
Мы за кавай духмяною зведалі
смак асалоды.

А пад вечар, з пявучаю назвай
карчомка «Ля Скала» —
Ціхі вырай сярод неспатольных
блуканняў —
Нам дала па кішэнях удар небывалы,
І так лёгка было, і ніякіх — ані! —
шкадаванняў.

А цяпер ні зіма ані восень —
сезон безназоўны,
Ці знячэўку жыццё саслізнула
ў разлом пазачасся,
І наіўна чакае душа,
як басяк той бяссонны,
Каб адбыўся, каб здарыўся цуд,
хоць бы з ветрам прымчаўся.

***

Серабрыстых струн дажджу перазвон
Па настылых перастуджаных дахах
Абвяшчае нам вясновы сезон,
Вызваленне ад цяжкіх апранахаў.

Грукаецца ў вокны хацін,
Крыўдаў леташніх змываючы копаць,
Накладае на тугу каранцін,
Кліча хлопцаў па калюгах паскокаць.

Дождж вясновы ўсміхнецца табе
Вачанятамі навюткай лістоты;
Запрашаючы гуляць па траве,
Сыпне рытмамі вясёлых чачотак.

Зашумуе ў гаманкіх ручаях
Застарэлае ашмоцце маркоты,
І сплыве кудысь нічыя,
З ветразем газетным, самота.

Шум падымуць у двары вераб'і,
Ігнаруючы прамоклую кошку,
І зальюць святлом ліхтары
Мне й табе насустрач дарожку.

А калі ўсё нахлусіў гэты дождж
Нам пра ростань і спатканне пад вечар,
Ты скажы тады сабе: «Дык і што ж,
Скончыцца разлука сустрэчай!»

Ўсё адно нам разам быць так і так —
Ёсць на тое пастанова Алаха,
Проста дождж вясновы, гарэзны дзівак,
Зблытаў год, калі танчыў на дахах.

Эцюд Надзеі

Давай забудзем
Пра ліхія часы,
Пра зняможаны будзень
І чужыя нам галасы,

Давай разгорнем
Наш сямейны альбом,
Дзе ўсе мы трое,
І гасцей поўны дом;

Дзе мы маладыя,
І вясельны наш баль,
І сябры дарагія
Напаўняюць крышталь;

Дзе наш сын з бліскам снегу
Па дзяцінстве ляціць
І шчырыйскае неба
Яго смехам звініць;

Дзе чароўнаю Прагай
Мы так чынна ідзем,
А на моры ты — праўда! —
Вартая дыядэм;

Дзе ў люстэркавым ззянні,
Над карункамі веж,
Ты праз венскія залі
Каралевай плывеш;

Дзе блукаем у красках
І ля замкаў стаім,
Дзе мы верылі казкам
І дзівосам усім;

Дзе мы шчасце спазналі...
І не след сумаваць!
Мы яшчэ не спаткалі
Ўсё, што маем спаткаць.

Так, мы шчасце спасціглі,
Каштавалі нагбом!
І цудоўныя хвілі
Наш папоўняць альбом.

***

Апошнім росчыркам барвовым
Праменне след растаў за морам;
Надзеяў караван гандлёвы
У вышыні нам склаўся з зорак.

Ён рушыць плынна ў ноч, без гуку,
На водсвет месяцовых прошчаў;
За мары, што вязе, — разлуку
Бярэ ён платай заміж грошай.

І плацім мы яму звыш коштаў,
У падарожжы з ім па небе,
За віртуальны жар пяшчотаў,
Дзе ноч, як быль, а ранак — небыт.

Мы з караванам узыходзім
У летуценны сад планетаў,
У пазасведамай прыгодзе
Пра лёс гадаючы з прыкметаў.

Перабіраю сноў каралі
У куфрах мрояў ды чаканняў
І так хачу, каб нам не стала
Чым разлічыцца на світанні,

І караван растаў, як дымка,
А нас пакінуў пры дарозе,
І зноў прыйшло цяпло абдымкаў,
Забыліся разлукі крозы.


І, бачыць Бог, павінна стацца,
Што нам аднойчы на дасвецці
Не давядзецца расставацца...
А дата покуль што ў сакрэце.

Пераклад з рускай мовы
Галіны Дубянецкай

ПРЭМІІ

Прэмія за арабскую літаратуру

Егіпецкі пісьменнік Мухамед Абдэльнабі атрымаў Прэмію за літаратуру на арабскай мове («Prix de la Litterature Arabe») — за свой раман «La Chambre de l'araignée» («Пакой павука»), перакладзены Жылем Гацье з арабскай на французскую.



Раман, напісаны Абдэльнабі ў 2016 годзе, быў выдадзены ў французскім перакладзе вясной 2019 года і трапіў у кароткі спіс французскай літаратурнай узнагароды ў ліку сямі фіналістаў. Уручэнне прэміі адбылося ў французскім Інстытуце арабскіх краін: аўтар кнігі-пераможцы і ягоны перакладчык атрымалі па 10 тысячаў еўра.

Згаданы раман Мухамеда Абдэльнабі ўвайшоў і ў кароткі спіс намінантаў Міжнароднай прэміі за арабскую мастацкую літаратуру (IPAF) 2017 года. На англійскай мове яго апублікавалі ў мінулым годзе ў перакладзе Джанатана Райта пад назвай "У пакоі павука». Малады аўтар таксама атрымаў прэмію «ArabLit» за лепшы дэбют — за апавяданне «Наша гісторыя». У 2010 годзе зборнік апавяданняў Абдэльнабі «Прывід Антона Чэхава» ганараваўся літаратурнай Прэміяй Савірыса («Sawiris Literature Prize»), а апошні зборнік пісьменніка «Як праходзіць паводка спячай вёскі» («As the Flood Passes the Sleeping Village») атрымаў прыз за лепшую падборку апавяданняў на кніжным кірмашы ў Каіры ў 2015 годзе.

Прэмія за лепшую кнігу пра Маскву

З'явілася новая прэмія, арганізаваная расійскім Фондам развіцця сучаснага мастацтва. Яе будуць уручаць за творы, якія напісаны ў Маскве і пра Маскву ў любым з жанраў і кірункаў сучаснага мастацтва.

Заяўкі на атрыманне «Маскоўскай мастацкай прэміі» прымаюцца да канца года. На сайце ўзнагароды адзначана: «Прэміі прысуджаюцца за выдатны ўклад у развіццё культуры і сучаснага мастацтва: за найбольш таленавітыя творы літаратуры, музыкі, тэатра, кіно і выяўленчых відаў мастацтва, якія адрозніваюцца навізной і арыгінальнасцю і якія атрымалі грамадскае прызнанне ды сталі з'явай культурнага жыцця Масквы».

Прэмія мае 5 намінацый: «Літаратура», «Музыка», «Тэатр», «Кіно» і «Выяўленчае мастацтва і архітэктура». Вынікі абвесцяць у красавіку 2020 года, а ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца ў траўні ў маскоўскім парку «Зараддзе».

Прызавы фонд «Маскоўскай мастацкай прэміі» складзе 33 мільёны расійскіх рублёў (каля 550 000 долараў ЗША). У кожнай з 5 намінацый прысудзяць па 3 прэміі памерам 3, 2 і 1 мільёны расійскіх рублёў. А ўладальніку Гран-пры ўручаць яшчэ 3 мільёны.

Арэнда пакояў Гары Потэра

На online-пляцоўцы для размяшчэння, пошуку і кароткатэрміновай арэнды прыватнага жылля па ўсім свеце — сайце Airbnb.com — з'явілася аб'ява аб здачы камфартабельных пакояў на дваіх у «фамільным доме Гары Потэра».



Дом «De Vere House» размешчаны ў вёсцы Лавенхэм у графстве Суфолк (Вялікабрытанія), якое ў кінакарцінах пра хлопчыка-які-выжыў прадстаўлялі Годрыкавай лагчынай. Менавіта тут, як вынікае з кніг, і нарадзіўся знакаміты на ўвесь свет чараўнік Гары Потэр, там жа Лорд Валан-дэ-Морт забіў яго бацькоў, у Годрыкавай лагчыне жылі шматлікія персанажы з кніг брытанскай пісьменніцы Джоан Роўлінг.

Пакой у доме можна арандаваць мінімум на дзве начы, а пражыванне разам са сняданкамі абыдзецца падарожнікам 254 фунты стэрлінгаў (800 беларускіх рублёў). Абодва пакоі, якія здаюцца, маюць асобны ўваход, ложак з балдахінам, асобны ванны пакой, месца для працы на ноўтбуку, тэлевізар, Wi-Fi. Акрамя гэтага, госці могуць выходзіць у гасціную з камінам і ў сад. Англійскі сняданак падаецца ў сталовай галоўнага крыла дома.

Лавенхэм з'яўляецца найлепшай сярэднявечнай вёскай у Брытаніі, бо ў ёй выдатна захаваліся больш чым 300 ахоўных аб'ектаў гістарычнай спадчыны. Там знаходзяцца цудоўная сярэднявечная царква, некалькі рэстаранаў, мноства цікавых рамесных і антыкварных крам, кавярні, мясныя лаўкі, пякарні, тры бакалейныя крамы, спа-салон, два музеі, мастацкая галерэя, тэнісныя корты і чатыры палі для гольфа. «De Vere House» размешчаны ў самым цэнтры гэтай прыгожай і маляўнічай вёскі.

Пра сябе гаспадары пішуць: «Уладальнікі жывуць у галоўным доме і любяць распавядаць пра яго гісторыі і гісторыі нашай дзіўнай вёскі. У нас таксама ёсць улёткі, карты і даведнікі, якія госці могуць узяць напракат і пагладзець, што наведаць і дзе можна паесці».

Дарэчы, пакоі ў «доме Гары Потэра» арандаваны на ўсе даты ўжо да наступнага сакавіка.

Міні-кніжка Шарлоты Брантэ

Пасля некалькіх гадоў пошуку неверагодна рэдкай маленькай кнігі падлетка Шарлоты Брантэ Таварыства сясцёр Брантэ выкупіла яе на парыжскім аўкцыёне.



Таварыства заплаціла за яе 600 000 еўра (плюс аўкцыённыя выдаткі). Кніга мае памер усяго 35х61 міліметраў. Напісаная ў 1830 годзе, калі Шарлоце было 14 гадоў, яна з'яўляецца часткай серыі з шасці міні-кніжак, створанай аўтаркай у падлеткавым узросце. Вядома, што захаваліся толькі пяць экземпляраў, адна кніжка знікла ў 1930 годзе.

Кніга будзе перададзена музею Брантэ, які месціцца ў былым сямейным доме ў Хаўорце (Ёркшыр). Там ужо захоўваюцца астатнія чатыры мініяцюрныя кнігі пад назвай «Часопісы для маладых мужчын».

Неапублікаваны рукапіс складаецца з трох розных апавяданяў, адзін з якіх разглядаецца як папярэднік сцэнаў у «Джэйн Эйр». Апошні раз рукапісная міні-кніжка выстаўлялася на аўкцыёне ў 2011 годзе, але тады Таварыства сясцёр Брантэ не змагло яго набыць. Таварыства асцерагалася, што рукапіс патрапіць у прыватныя рукі, але дзякуючы чатырохтыднёвай публічнай кампаніі, якая праводзілася актывісткамі Джудзі Дэнч і Жаклін Ўілсан, Таварыства атрымала больш за 85 000 фунтаў стэрлінгаў у выглядзе грамадскіх ахвяраванняў, а таксама грант ад Мемарыяльнага фонда нацыянальнай спадчыны.

«Мы былі агаломшаны падтрымкай ад людзей з усяго свету, якія дапамаглі нашай кампаніі, і не можам дачакацца, калі кніжка будзе на месцы побач з іншымі экземплярамі, даступная для ўсіх», — адзначыла Кіці Райт, выканаўчая дырэктарка Таварыства сясцёр Брантэ.

Эн Дынсдэйл, куратарка праекта, сказала, што вяртанне ўнікальнага рукапісу было «галоўнай падзеяй маіх 30 гадоў працы ў музеі» і дадала: «Шарлота напісала гэты малюсенькі часопіс для цацачных салдацікаў, з якімі яна і яе браты гулялі, і калі мы праходзім праз тыя ж пакоі, што і яны, здаецца вельмі дарэчным, што рукапіс вяртаецца дадому, і мы хацелі б сказаць вялікі дзякуй усім, хто зрабіў гэта магчымым».

Прадаецца дом Толкіна

Для прыхільнікаў «Уладара пярсцёнкаў» з'явіліся цікавыя навіны: у Англіі выстаўлены на продаж дом Джона Р. Р. Толкіна.

Менавіта там аўтар напісаў казачную аповесць пра прыгоды Більба Бэгінса «Хобіт» і трылогію «Уладар пярсцёнкаў», «Сільмарыльён» ды іншыя творы пра Міжзем'е.

Агенцтва нерухомасці «Breckon & Breckon» выставіла на продаж дом знакамітага ва ўсім свеце пісьменніка за 4,6 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, або 5,9 мільёнаў долараў ЗША. Ад оксфардскай сядзібы Толкіна да Лондана — 90 кіламетраў, дом жа захаваўся практычна ў тым жа стане, у якім быў пабудаваны ў 1924 годзе.



Брытанскі пісьменнік і лінгвіст жыў у тым доме з 1930 па 1947 гады і, мяркуючы па ўсім, правёў у ім нямала шчаслівых дзён са сваёй сям'ёй. Пісьменніцкая праца была хобі для оксфардскага прафесара-лінгвіста, як, зрэшты, і прыдумлянне эльфійскіх моў.

Двухпавярховы сямейны дом Толкіна вельмі прасторны: ён займае каля 4 тысячаў квадратных футаў (больш за 370 м²), з высокімі столямі, дзвюма гасцінымі, кухняй — пакоем для сняданку, з шасцю спальнямі, каморай, гардэробнай, ваннымі ды іншымі пакоямі. Інтэр'еры памяшканняў максімальна захаваны, і седзячы ва ўтульным пісьменніцкім фатэлі, лёгка ўявіць, як ствараліся вобразы Гэндальфа, Арагорна, Элранда, Галадрыэлі, Легаласа, Гімлі, Торына Дубашчыта, Берэна і многіх іншых.

Дом у цэнтральнай частцы заходняга Оксфарда мае таксама прасторны ўнутраны двор з дрэвамі, вялікі луг ды некаторыя гаспадарчыя пабудовы.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы парталаў «ArabLit», «ГодЛитературы», «The Guardian», «HouseBeautiful», novostiliteratury.ru і «The Associated Press».

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by